ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 232 (3340) Чацьвер 10 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ТОКІЁ, 9. Па паведамленьні агэнцтва Сін-Бун-Рэнго з Мукдэну, 8-га кастрычніка ў Хайшане (паўднёвая Манчжурыя) японскія салдаты былі абстрэляны кітайцамі. Японскія вайсковыя ўлады прыцягнулі да суду непадаўшых

ЧАСТКІ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

2.500 пудоў хлеба дзяржаве

ГЛУСК. (Наш кар.). 6-га кастрычніка сяляне Клятнянскага сельсавету прывезьлі ў Глуск чырвоным абозам больш чым на 200 фурманках каля 2.500 пудоў хлеба

Бальшавіцкае прывітаньне 4 усебеларускаму зьезду с.-г. каапэрацыі

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі--асноўны шлях сацыялістычнай перабудовы вёскі

Работу с.-г. каапэрацыі перавесьці на вытворчыя рэйкі, поўнасьцю абслужыць калгасы, бядняцка-серадняцкія масы, забясьпечыць іх крэдытам, машынамі, насеньнем і ўгнаеньнем.—Абвясьціць бязьлітасную барацьбу скажэньням лініі партыі ў практычнай рабоце с.-г. каапэрацыі, выкрыць усе спробы дапамогі кулаку і моцнаму гаспадару

Да ўсебеларускага зьезду сельска-гаспадарчай каапэрацыі

Падпарадкаваць работу с.-г. каапэрацыі задачам сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі

Сёньня ў Менску адкрываецца 4-ты ўсебеларускі зьезд с.-г. каапэрацыі. Зьезд павінен абгаварыць пытаньні аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і задачах сельска-гаспадарчай каапэрацыі, арганізацыйнай пабудове сельска-гаспадарчай каапэрацыі, справаздачу Белсельсаюзу, даклад рэвізійнай камісіі і пяцігадовы плян разьвіцьця сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Зьезд с.-г. каапэрацыі адбываецца якраз у момант рашучага разгортваньня рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, калектывізацыі і масавага вытворчага каапэраваньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у часе пералому ў рабоце сыстэмы с.-г. каапэрацыі. Асабліва важна тое, што зьезд склікаецца ў пачатку новага гаспадарчага году, які прадугляе рашучыя запатрабаваньні с.-г. каапэрацыі. Трэба забясьпечыць сельскую гаспадарку буйнымі, больш складанымі с.-г. машынамі, якія дапамагаюць уздымуў ўраджайнасьці і аграмаджаньню працэсу апрацоўкі зямлі, поўнасьцю правесьці клясавую лінію ў справе забясьпячэньня машынамі, не дапусьціць, каб хоць адна машына трапіла ў рукі кулака. Мы зараз маем у БССР 118 трактараў, а нам патрэбна, як мінімум, 495 штук, каб задаволіць патрэбы буйных калгасаў.

Трэба шырока паставіць на зьезьдзе пытаньне аб хлебазагатоўках і наогул аб поўным выкананьні загатоўчага пляну сыстэмай с.-г. каапэрацыі — асноўным загатоўшчыкам на вёсцы. Ні ў якім разе нельга дапушчаць у далейшым памылак, ажыятажу і хвасьцізму, якія мелі месца пры загатоўках у мінулым годзе

Абвастрэньне клясавай барацьбы на вёсцы, супраціўленьне кулацтва патрабуе ад нас вялікага націску на кулацкую верхавіну вёскі пры выкананьні загатоўчых плянаў. Выкачка лішкаў хлеба ў кулацтва, спагнаньне закантрактаванай прадукцыі і крэдытных пазык павінны праходзіць пад знакам клясавае барацьбы, пры самым строгім захаваньні клясавае лініі. Трэба абвясьціць рашучую барацьбу разбэшчанасьці, неахайнасьці і хвасьцізму ў каапэрацыйных працаўніках.

Мінулыя два гады былі пэрыядам росту і ўзмацненьня сацыялістычных элемэнтаў вёскі на падставе ажыцьцяўленьня дырэктыў 15 с'езду партыі.

Гэтыя два гады зьявіліся пэрыядам рашучага зруху ў разьвіцьці сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Вырасла сетка каапэрацыі, ахоплены новыя пласты насельніцтва, паглыбіліся працэсы вытворчага каапэраваньня.

На 1-е кастрычніка 1927 году мы мелі 1.297 першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў разам з калгасамі і с.-г. крэдытнымі таварыствамі з 282 тыс. членаў і 30 проц. усіх каапэраваных двароў. На 1-е кастрычніка 1929 году мы маем 5.000 аб'яднаньняў, 580 тыс. пайшчыкаў і 70,1 проц. (калі лічыць пайшчыка за двор) каапэраваных двароў. Такім чынам, нізавая каапэрацыйная сетка за два гады вырасла ў 2 з палов. разы.

Асаблівай увагі заслугоўвае рост калгасаў. На 1-е кастрычніка 1927 году мы мелі 440 калгасаў, 4.300 членаў калгасаў. Зараз на 1 кастрычніка 1929 году мы маем 1.900 калгасаў і 26.000 пайшчыкаў у іх. Два гады назад плошча зямлі пад калгасамі была роўна 0,5 проц. агульнае плошчы, зараз — 3,5 проц.; сярэдні разьмер калгасаў з 60-80 гэкт. павялічыўся да 190 гэкт.

Два гады назад мы рабілі першыя крокі ў калектывізацыі. Зараз мы наглядаем вялізарнейшы рух за калектывізацыю самых шырокіх серадняцка-бядняцкіх пластоў насельніцтва. У нас ёсьць у радзе округ калгасы, якія займаюць да 4.000 гэкт.

Але нам нельга супакоіцца на дасягнутых посьпехах, а трэба самым рашучым тэмпам разгортваць калектывізацыю, прыстасоўваючы да калектывізацыі ўсе мерапрыемствы на вёсцы.

На працягу мінулага году шырока разгарнулася кантрактацыя пасеваў. Яна ахапіла каля 190 тыс. гэкт. розных пасеваў, у кантрактацыю ўцягнута каля 100 тыс. сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, з 812 тыс. сялянскіх гаспадарак ахоплена калгасамі 1/33 частка, а кантрактацыяй — 1/8 частка гаспадарак.

Трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на арганізацыю нацыянальных калгасаў. Па даных н 1-е кастрычніка 1928 году мы мелі 74,6 проц. беларускіх калгасаў, 23,7 проц. ўкраінскіх, 1,3 проц. польскіх і г. д. Зараз трэба павялічыць колькасьць калгасаў, арганізаваных з беднякоў і сераднякоў нацыянальных меншасьцяй.

Зьезду прыдзецца спыніцца на пытаньні аб клясавай лініі ў нізавой сетцы каапэрацыі. Хоць за мінулыя два гады ўдалося выправіць клясавую лінію ў практычнай рабоце, але дзе-ні-дзе яшчэ ёсьць выпадкі скажэньня клясавай лініі, праяўленьні крэдытаваньня і дапамогі кулацтву. Гэтым зьявішчам трэба абвясьціць самую бязьлітасную барацьбу.

За мінулыя два гады значна вырасла роля с.-г. каапэрацыі, як асноўнага арганізатара абмену паміж горадам і вёскай. У 1927-28 годзе было загатоўлена прадуктаў на 13 мільёнаў руб., у мінулым — на 18 з палов. млн., зараз складзены плян на 30 мільёнаў руб. Загатоўкі с.-г. каапэрацыі складаюць 50 проц. плянавых загатовак. Сельска-гаспадарчая каапэрацыя павінна надалей узмацніць свае пазыцыі ў галіне тавараразвароту, адзіным фронтам з спажывецкай каапэрацыяй і дзяржаўнымі арганізацыямі выціснуць з рынку прыватніка і кулака.

Трэба адзначыць, што арганізацыйная структура с.-г. каапэрацыі адставала ад стыхійнага росту каапэрацыйнага руху; слаба абслуговаліся гаспадарчыя інтарэсы насельніцтва, малая ўвага аддавалася інтарэсам беднаты, кульгаў клясавы падыход пры крэдытаваньні, ня было рашучага вылучэньня беднаты ў кіруючыя органы каапэрацыі, нізавая сетка каапэрацыі ня была зьвязана паміж сабой.

Перад зьездам стаіць задача — паставіць працу с.-г. каапэрацыі на вытворчыя рэйкі, знайсьці новыя мэтады, якія-б далі магчымасьць поўнасьцю абслужыць бядняцка-серадняцкія масы і дапамагаць сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

А. ДУБІНА.

Пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР аб рабоце ЦКК-РСІ Беларусі

па дакладу т. КАЛНІНА і судакладу т. БЕЛЕНЬКАГА

Заслухаўшы даклад т. КАЛНІНА і судаклад члена ЦКК УсеКП(б) т. БЕЛЕНЬКАГА, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) лічыць работу ЦКК-РСІ Беларусі ў асноўным здавальняючай.

ЦКК-РСІ Беларусі быў праведзены рад грунтоўных абсьледаваньняў (як па сваім плане, так і па заданьнях НК РСІ СССР), накіраваных да ўпарадкаваньня асобных відаў савецкай і гаспадарчай работы. У прыватнасьці была праведзена работа ў галіне рэарганізацыі савецкага апарату па функцыянальнай сыстэме і па пашырэньні нізавога савапарату. Была ўзмоцнена за справаздачны перыяд масавая работа органаў КК-РСІ (больш шырокае прыцягненьне працоўных да работы РСІ, узмацненьне справаздачы перад масамі, больш значнае асьвятленьне ў друку работы ЦКК-РСІ).

Разам з гэтым, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) павінен адзначыць рад істотных недахопаў у рабоце органаў КК-РСІ Беларусі:

Пры наяўнасьці сыгналізуючых фактараў хваравітых зьявішч у некаторых партарганізацыях, ЦКК Беларусі не прымала своечасова адпаведных мер па іх выкрыцьцці і дапусьціла зацяжку ў правядзеньні мерапрыемстваў па аздараўленьні арганізацый (Мазыр).

Не праявіла дастатковай рашучасьці як у зьняцьці з адказных пастоў работнікаў, не апраўдаўшых сябе на кіруючай рабоце, так і ў асобных выпадках па барацьбе з скрыўленьнем клясавай лініі.

Некаторыя КК-РСІ праявілі слабасьць па барацьбе з разлажэньнем і зажымам самакрытыкі ў партарганізацыях, фармальна адносіліся да разбору рабселькораўскіх заметак.

Лічыць адным з важнейшых задач ЦКК Беларусі, пры правядзеньні чысткі партыі і савапарату, рашучае ачышчэньне судова-сьледчых органаў ад клясава чужых, разлажыўшыхся элемэнтаў і парушыцеляў рэвалюцыйнай законнасьці.

Сыстэматычна праводзіць правядзеньне дырэктыў партыі ва ўсіх галінах работы савецкага і гаспадарчага апарату, у прыватнасьці зьвярнуць увагу на праверку рэвалюцыйнай законнасьці шляхам пастаноўкі на пленумах (прэзыдыумах) КК дакладаў аб рабоце суда і пракуратуры і дабіцца своечасовага разгляду спраў, якія перадаюцца КК-РСІ ў судова-сьледчыя органы.

Адзначыць засьмечанасьць і сыстэматычнае скрыўленьне клясавай лініі ў рабоце зямельных і фінансавых органаў Беларусі, якія выказаліся ў насяджэньні хутарскіх гаспадарак, патураньні кулацкім элемэнтам пры размяркоўваньні зямельных, лясных і ічш. угодзьдзяў, недаабкладаньні кулацкіх, пераабкладаньні серадняцкіх гаспадарак і г. д.

Прыняць пад увагу рашэньні прэзыдыуму ЦКК Беларусі з 17 студзеня 1929 г., якія накіраваны на аздараўленьне работы зямельных органаў і ліквідацыю заўважаных агіднасьцяй.

У далейшым ЦКК Беларусі неабходна ўзмацніць кантроль над правільным правядзеньнем зямельнай і падатковай палітыкі партыі, правесьці рашучае аздараўленьне зямельных і фінансавых органаў шляхам выдаленьня клясава чужых элемэнтаў і вылучэньня на працу рабочага і бядняцкага актыву.

ЦКК-РСІ Беларусі ў галіне рацыяналізацыі прамысловасьці не дасягнула істотных вынікаў і не прыняла адпаведных мер па перамаганьні супраціўленьня ВСНГ БССР правядзеньню ў жыцьцё пастаноў пленуму ЦКК УсеКП(б).

ЦКК-РСІ Беларусі павінна ў бліжэйшы час дабіцца рашучага пералому ў справе ўзмацненьня рацыяналізацыі прамысловасьці і мабілізаваць вакол гэтай задачы рабочую грамадзкасьць.

ЦКК-РСІ Беларусі ня было ўдзелена дастатковай увагі важнейшаму ва ўмовах Беларусі пытаньню разьвіцьця саматужнай прамысловасьці. Рашэньні ЦКК Беларусі па абсьледваньні гэтай галіны ў 1928 годзе аказаліся ў значнай ступені нявыкананымі.

ЦКК-РСІ Беларусі павінна прыняць рашучыя меры па правядзеньні ў жыцьцё рашэньняў, якія накіраваны да ўсямернага разьвіцьця саматужнай мясцовай прамысловасьці, узмацненьня каапэраваньня саматужнікаў, галоўным чынам у сельскіх раёнах, мястэчках і закончыць у бягучым годзе чыстку арцеляй ад кулацка-нэпманскіх элемэнтаў.

ЦКК-РСІ Беларусі правяла рад мерапрыемстваў па рацыяналізацыі капітальнага будаўніцтва. Але яшчэ яшчэ мае істотныя недахопы, у прыватнасьці кярэдка мае месца неўгрунтаванае па сваёй мэтазгоднасьці і эфэктыўнасьці будаўніцтва.

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі рашуча дабіцца аздараўленьня капітальнага будаўніцтва, у прыватнасьці ўдзяліць большую ўвагу пытаньням мэтазгоднага накіраваньня і эфэктыўнага выкарыстаньня сродкаў, што адпускаюцца на капітальнае будаўніцтва як прамысловае, так і камунальнае.

Канстатаваць, што дырэктыва аб 20-процантным зьніжэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў ня выканана поўнасьцю (у прыватнасьці гаспадарчымі органамі толькі на 7,9 проц.).

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі ў працягу 1928-29 году выканаць дырэктывы ў гэтай галіне, праводзячы сваю працу пры шырокім удзеле рабочай грамадзкасьці, прыцягваючы віноўных у парушэньні дырэктыў да суровай адказнасьці.

Прапанаваць ЦКК Беларусі ў далейшым своечасова і больш рашуча рэагаваць на ўзьнікаючыя хваравітыя зьявішчы ў партарганізацыях і савецкім апараце, забясьпечыўшы поўнае правядзеньне самакрытыкі, агараджаючы крытыкуючых ад усякага роду пераследваньняў, прыцягваючы ўсіх, хто парушае дырэктывы партыі, да суровейшай адказнасьці.

Жорстка праводзіць рашэньні 16 партканфэрэнцыі аб спыненьні перабросак адказных работнікаў, якія аказаліся няпрыгоднымі для кіраўнічай працы, з установы ў установу, з раёну ў раён, у прыватнасьці сумесна з ЦК КП(б)Б Беларусі абмеркаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці далейшага прабываньня на адказных пастох былых кіраўнікоў акруговых арганізацый, адкліканых з іх у выніку выкрыцьця хваравітых зьявішч.

Прапанаваць ЦКК Беларусі дабіцца ўзмацненьня органаў КК-РСІ партыйна-вытрыманымі, кваліфікаванымі працаўнікамі для ўзмацненьня з боку КК-РСІ барацьбы з хваравітымі зьявішчамі і своечасовай інфармацыяй аб іх ЦКК Беларусі і забясьпечыць хуткае расьсьледваньне рабселькораўскіх заметак.

Пры стракатым нацыянальным складзе Беларусі маюцца ў радзе фактаў скажэньні нацыянальнай палітыкі партыі. ЦКК Беларусі не ўдзяліла дастатковай увагі нацыянальнаму пытаньню (усе гады падрад у плян работ ЦКК было ўключана пытаньне аб правядзеньні нацпалітыкі і на было выкананае).

Прапанаваць ЦКК Беларусі ўключыць у плян работ 1929-30 г. праверку выкананьня дырэктыў партыі ў галіне нацпалітыкі, узмацніць барацьбу з праяўленьнямі шавінізму і антысэмітызму. —

ЦКК Беларусі, змагаючыся з асобнымі фактамі разлажэньня судова - сьледчага апарату і парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці ў радзе округаў (Мазыр, Ворша, Полацак, Віцебск), не паставіла ва ўсёй шырыні пытаньня аб аздараўленьні судова - сьледчай працы ў цэлым.

Зьвярнуць увагу на слабую пастаноўку ЦКК-РСІ кантролю і праверкі сваіх рашэньняў, на недастатковую увагу з боку абсьледваных органаў да правядзеньня ў жыцьцё рашэньняў ЦКК РСІ.

Прапанаваць ЦКК-РСІ Беларусі наладзіць кантроль і фактычную праверку выкананьня сваіх рашэньняў шляхам непасрэдных паўторных абсьледваньняў, а таксама шляхам прыцягненьня да гэтае работы парт'ячэек, вытворчых эканомнарад, часовых кантрольных камісій, сэкцый РСІ, рабселькораў, лёгкай кавалерыі і друку. Віноўных у невыкананьні рашэньняў РСІ прыцягваць да суровай адказнасьці ў партыйным і савецкім парадку.

Адзначыць, што ў працы бюро скаргаў — слабы арганізацыйны ахоп працы з масамі і адсутнасьць абагуленьня недахопаў у працы дзяржапарату. Для ўхіленьня асноўных прычын скаргаў— недастаткова хуткі разбор скаргаў і слабая пастаноўка кантролю як за праходжаньнем скаргаў, так і за выкананьнем рашэньняў бюро скаргаў.

Прыняць пад увагу, што на красавіковым пленуме ЦКК Беларусі былі прыняты рашэньні аб узмацненьні і ўпарадкаваньні работы бюро скаргаў.

ФАШЫСТЫЯ АЎСТРЫІ РЫХТУЮЦЬ ПЕРАВАРОТ

Шобэр выдае закон супроць забастовак

КАПІТУЛЯНЦКІЯ НАСТРОІ САЦ.-ДЭМАКРАТЫІ

ВЕНА, 6. Акрамя законапраекту, які адносіцца да перагляду канстытуцыі, урад памерен унесьці, паводле паведамленьняў сёньнешніх газэт, яшчэ так званы законапраект «супроць тэрору», які забараняе забастоўкі, калі рабочыя патрабуюць выдаленьня з прадпрыемства фашыстых або членаў хрысьціянскіх саюзаў. У выглядзе кары за абвяшчэньне забастоўкі супроць найму фашыстых або членаў хрысьціянскіх саюзаў прадугледжана турэмнае зьняволеньне тэрмінам да трох год.

Суды прысяжных будуць або зусім скасаваны, або кампэтэнцыя іх будзе значна звужана.

Урад Шобэра падрыхтоўвае далей законапраект аб друку, які прадугледжвае адналўленьне цэнзуры. Адзін з самых істотных пунктаў новага законапраекту прадугледжвае справы аб зьняважаньні ў друку. Гэты пункт накіраваны перш за ўсё супроць пралетарскага друку.

ВЕНА, 8. Яскравым адлюстраваньнем капітулянцкіх настрояў аўстрыйскай сацыял-дэмакратыі зьяўляюцца апошнія выступленьні яе лідэраў Зэйца і Рэнэра. Выступаючы на адкрыцьці новай венскай вобшчыны, Зэйц (бургамістар Вены) забягаў ласкі ўраду Шобэра і вельмі нясьмела пратэставаў супроць праекту абярнуць Вену з самастойнай правінцыі ў муніцыпалітэт.

Прамова Рэнэра на сацыял дэмакратычным сходзе ў Вінэр-Нэйштадтце прадстаўляе сабою поўнае «откровение». Аказваецца, што не сацыял-дэмакратыя капітулявала, а буржуазія, «спалохаўшыся ўласных банд (хэймвэру), уцякла пад ахову паліцыі». Так тлумачыць Рэнэр прыход да ўлады паліцэйн прэзыдэнта Шобэра. Паводле слоў Рэнэра выходзіць, шт Шобэр заклікаў ны не для ліквідацыі дзяржаўнага ладу, дэмакратычнасьцю якога так гонарацца аўстрыйскія сацыял-дэмакраты, а для таго, каб «палітыкай халоднага кампрэсу супакоіць разбушаваны хэймвэр».

Камэнтуючы капітулянцкае выступленьне Зэйца, фашысцкая «Дэйтч-Эстэрэйхішэ Тагесцэйтунг» гіранічна заўважвае: «Ніхто ня будзе зьдзіўлены, калі Карл Зэйц запішацца ў бліжэйшыя дні ў адзін з батальёнаў хэймвэру».

Адзін з лідэраў хэймвэру, праф. Отэ, гэтымі днямі паведаміў на публічным сходзе, што раней, чым заняць пост прэм'ера, Шобэр патрабаваў прасіць ад яго прабачэньня за нападкі, якія ён меў з боку сацыял-дэмакратыі ў апошнія гады. Паводле слоў Отэ, Зэйц наведаў Шобэра і прасіў ад яго прабачэньня.

Зноў фашысцкія дэманстрацыі па ўсёй краіне

ВЕНА, 8. Пасьля кароткага зацішша ў краіне зноў адбываюцца фашысцкія дэманстрацыі. Зараз наглядаецца нарастаньне хвалі акты - фашысцкіх рабочых контр-дэманстрацый. 6-га кастрычніка адбыліся сутычкі паміж рабочымі і дэманстраваўшымі фашыстымі ў Урсэнбэргу і ў Падэрсдорфе. У абодвых мясцох у выніку сутычак налічваецца шмат параненых. Падасьпеўшая жандармэрыя разагнала рабочых.

У той-жа дзень камуністычная партыя арганізавала ў Мэдынгу дэманстрацыю пад лозунгам «Барацьба супроць фашызму і ваеннай небясьпекі». У дэманстрацыі прынялі ўдзел венскія камсамольцы. Рабочыя віталі дэманстрантаў і, асабліва, маршыраваўшую моладзь. Фашыстыя, якія асышалі дэманстрантаў лаянкаю, былі зьбіты. Прыбыўшая паліцыя пусьціла ў ход гумовыя дубінкі. Рабочыя абараняліся ад паліцэйскіх. Як паведамляе фашысцкі друк, члены рабочага спартыўнага гуртку напалі на атрад хэймвэраў, які арганізаваў дэманстрацыю ў Каппэн бэргу (Штырыя). 6 членаў хэймвэру цяжка паранены, некалькі рабочых арыштавана. Учора хэймвэр наладзіў у Вінэр - Нэйштадтце дэманстрацыйную маніфэстацыю, у сувязі з гадавінаю мінулагодняе дэманстрацыі. На фашысцкім мітынгу выступіў лідэр хэймвэру Верхняй Аўстрыі князь Штарэмбэрг.

Абурэньне рабочых яшчэ папярэдні дэманстрацыі хэймвэру выліўся ў стыхійную антыфашысцкую дэманстрацыю. Згодна паведамленьня органу эсдэкаў «Арбэйтэр Цайтунг», сацыял-дэмакраты, з мэтаю ўнікнуць сутычкі, арганізавалі ў той-жа дзень контр-сход, прычым, як гэта мела месца ў кастрычніку мінулага году, абедзьве дэманстрацыі на згодзе абодвых бакоў былі адзелены адна ад другой дротавымі загародкамі і ўзмоцненым парадам паліцыі.

Зьезд славянскіх геалёгаў ў Празе

ПРАГА, 8. 6-га кастрычніка ў Празе адбылося ўрачыстае адкрыцьцё зьезду славянскіх геалёгаў, на якім прысутны зьыш 500 дэлегатаў ад розных краёў. Паведамленьне старшыні зьезду аб тым, што ў працах зьезду прымаюць удзел таксама прадстаўнікі СССР, было спаткана воплескамі. Зьяўленьне на трыбуне старшыні савецкай дэлегацыі акадэміка Такуліна выклікала шумную авацыю зьезду. У сваёй прамове Такулін асабліва адзначыў ролю марксыцкага мэтада ў навуковай дасьледчай рабоце навуковых установ Савецкага Саюзу. Ня гледзячы на тое, што для прывітаньняў вырашана было даваць слова толькі прадстаўніком паасобных дзяржаў, на тым-жа паседжаньні асобна ад палякаў зьезд вітаў старшыня украінскага «Навуковага Таварыства» акадэмік Дубінскі. Беларэміграны слова не атрымалі. У сувязі з гэтым паданы ўчора ў прэзыдыум зьезду за подпісамі Ізабэкэра, Вербіна і іншых фармальны пратэст.

ШТО ДАСЬЦЬ ПЯЦІГОДКА ВЯЛІКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РАБОТ



Магнітагорскі дзяржаўны ўзгадаўнічы завод. Праект дзяржаўнага

КАБУЛ ЗАНЯТЫ ВОЙСКАМІ НАДЫР-ХАНА

Бачэ-Сакао зачыніўся ў цытадэлі

ТЭРМЭЗ, 7. Войска Надыр-Хана заняло ўвесь раён Кабула і ўсе пасяленьні, якія належаць да Кабула. Насельніцтва Лагору і ўсяго Кабульскага раёну падтрымлівае Надыр-Хана. Кугістанцы паслалі самалётам войскам, якія знаходзяцца ва ўсходніх правінцыях Аўганістану, загад, тэрмінова вярнуцца ў Кабул. Надыр-Хан выслаў моцны атрад Джэлалабацкаю дарогаю насустрач кугістанскаму войску.

ТЭРМЭЗ, 7. Атрыманы весткі, што кугістанскія войскі, якія знаходзяцца ў Гардэзе і Карыз—і—Дэрвішы, перадаліся Надыр-Хану.

***

ТЭРМЭЗ, 8. Войска Надыр-Хана 8-га раніцою з боем заняло фарты Кабула і ўвайшло ў горад. Бачэ-Сакао (Хабібула) зачыніўся ў цытадэлі ў цэнтры гораду.

***

ТЭРМЭЗ, 8. Па атрыманых толькі што вестках, брат Надыр-Хана Шахвар-Хан уступіў у Кабул.

Нарвэская кампартыя--за пастановы 10-га пленуму ВККІ

СТАКГОЛЬМ, 8. У Осло адбылася акруговая канфэрэнцыя Нарвэскае кампартыі, на якой была ўхвалена пастанова 10-га пленуму Выканкому Камінтэрну. Канфэрэнцыя зьвярнулася з заклікам да шведзкіх камуністычных дацьц адпор апартуністычнаму крылу шведзкай кампартыі. Важнай пастановай канфэрэнцыі зьяўляецца ўхвала цэнтралізаваць партыйны друк і выпусьціць акцыі для выданьня новага пашыранага цэнтральнага органу «Арбэйтэрэн» замест «Нордост Комуніст-Блат». Канфэрэнцыя пастанавіла 13-га кастрычніка арганізаваць сьвята чырвонага спорту, а ў лістападзе склікаць акруговую рабочую канфэрэнцыю.

Выдатныя супрацоўнікі групы Яваро́ўскага грабежнікі

ВАРШАВА, 8. Ва ўсім апазыцыйным друку надрукавана сэнсацыйнае паведамленьне аб тым, што ў замаху на паштовы цягнік над Анджэёвам з мэтаю рабаўніцтва прымалі ўдзел два выдатныя супрацоўнікі групы Яваро́ўскага, адзін з якіх зьяўляецца старшынёю Аджэёўскага акруговага камітэту гэтай групы. Улада стараецца прыкрыць гэту справу. Характэрна, што пэпэсэўская газэта канфіскавала за зьмяшчэньне артыкулаў аб рабаўніцтве пад Анджэёвам.

Забастоўка шофэраў у Осло

СТАКГОЛЬМ, 8. Як паведамляюць з Нарвэгіі, у Осло забаставалі 500 шофэраў, якія патрабуюць павышэньня зарплаты. Рабочыя аўта-рамонтнай майстэрні абвясьцілі забастоўку салідарнасьці.

45 міл. руб. на прамысловае будаўніцтва БССР у 1929-30 г.

МАСКВА, 9. На паседжаньні Дзяржпляну саюзу зацьверджаны кантрольныя лічбы прамысловага будаўніцтва Беларусі на 1929-30 г.

Усяго па беларускай прамысловасьці будзе патрачана больш 45 мільёнаў руб. супроць 48.170 тысяч, запатрабаваных ВСНГ БССР. З гэтай сумы на заканчэньне Гомельскага заводу сельгасмашын будзе патрачана 2 мільёны руб., на заканчэньне бабруйскага камбінату 1.500 тысяч руб., лесапільнага заводу ў Магілёве 130 тысяч руб., віцебскай швэйнай фабрыкі 940 тысяч руб., магілеўскага мастоўёўскага заводу 1.700 тысяч руб., віцебскага шчаціна-шчотачнага камбінату—600 тысяч руб., на капітальныя работы запалкавых фабрык «Кастрычнік» і «Чырвоная Бярэзіна»—720 тысяч, на заканчэньне будаўніцтва менскай кандытарскай фабрыкі 1.215 тысяч, барысаўскай макаронный фабрыкі —320 тысяч, віцебскага маслабойнага заводу 700 тысяч руб. Пазасталая сума будзе выдаткавана на новае капітальнае будаўніцтва.

На разьвіцьцё тарфяной прамысловасьці—959 тысяч руб. (пабудова ізаляцыйна-падсьцілачнага заводу, распрацоўка праекту брыкетнага заводу).

Па шкляной прамысловасьці мяркуецца выдатковаць 3 мільёны руб. (супроць 2 мільёнаў, якія просіць ВСНГ)—на пабудову гуты ў Гомелі. Для павялічэньня выпрацоўкі будаўнічых матар'ялаў пастаноўлена пабудаваць крычаўскі цэмэнтовы завод, 5 цагэльняў, адзін чарапічны і рад заводаў па вырабу вапны. Усяго на разьвіцьцё прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў пастаноўлена выдаткаваць больш 4-х мільёнаў руб.

На разьвіцьцё хэмпрамысловасьці мяркуецца патраціць 1.710 тысяч руб. Будзе пачата пабудова фасфарытнага заводу, 2-х фасфарытных млыноў, заводу магнэзіі, заводу па апрацоўцы касьцей. Па лясной прамысловасьці—будзе будавацца рэчыцкі фанэрны завод, полацкі і гомельскі камбінаты. Разам з сумай, якая адпускаецца на заканчэньне бабруйскага камбінату, на будаўніцтва лясной прамысловасьці Беларусі будзе патрачана 4.300 тысяч руб.

Па тэкстыльнай прамысловасьці — на будаўніцтва аршанскага ільнянога камбінату, віцебскіх трыкатажнай і баваўнянай фабрык будзе патрачана 3.900 тысяч рублёў.

На разьвіцьцё беларускай папяровай прамысловасьці — мяркуецца выдаткаваць 500 тысяч рублёў на будаўніцтва цэлюлёзна-папяровага камбінату ў Бабруйску.

Па харчовай прамысловасьці—пастаноўлена пабудаваць у бягучым годзе 2 крахмальных заводы і завод па перапрацоўцы фруктаў.

Міжнародная канфэрэнцыя па арганізацыі рэпарацыйнага банку

БЭРЛІН, 5. У Бадэн-Бадэне пачаліся пасяджэньні камітэту па арганізацыі міжнароднага рэпарацыйнага банку. Перад пачаткам канфэрэнцыі вяліся папярэднія перагаворы па пытаньні аб задачах гэтага банку паміж кіраўнікамі дзяржаўных банкаў, прадстаўленых на канфэрэнцыі. Прадстаўнік Англіі выказаў думку, да якой далучыліся і некаторыя іншыя дэлегаты, што галоўнай задачай міжнароднага банку зьяўляецца ня толькі ўрэгуляваньне рэпарацыйных плацяжоў, якія паступаюць згодна пляну Юнга, але абарона міжнароднага фінансавага становішча і папярэджаньне валютных катастроф. Адным з самых «няпрыемных» пытаньняў бадэн-бадэнскай канфэрэнцыі зьяўляецца пытаньне аб месцазнаходжаньні міжнароднага банку, якое будзе вырашана ў самым канцы работ канфэрэнцыі. Мяркуюць, што згода на гэтым пытаньні можа быць дасягнута толькі шляхам сур'ёзных фінансавапалітычных уступак у адносінах да некаторых дзяржаў. Мажлівымі пунктамі месцазнаходжаньня банку называюць Лёндан, Амстэрдам і Цюрых.

Думка аб стварэньні звышбанку або інакш «міжнароднага банку па разьліках», узьнікла, як вядома, у сувязі з нядаўняй пастановай міжнароднай канфэрэнцыі ў Гаазэ аб нямецкіх кантрыбуцыйных плацяжох. Утварылі славуты «плян Юнга», паводле якога Нямеччына будзе плаціць 37 год па 2 мільярды, але адначасова пастанавілі ўтварыць, быццам для палягчэньня ўзаемных разьлікаў, свайго роду «звышбанк», г. зн. такі банк, які не належаў-бы да якой-небудзь адной дзяржавы і аб'ядноў-бы банкаўскую дзейнасьць усіх. Са «скромнасьці» было пастаноўлена, што асноўны капітал звышбанку будзе складаць «усяго» 100 мільёнаў долараў, пры чым гэта сума будзе ўнесена ў роўнай часьці галоўнейшымі даўжнікамі Нямеччыны і самой Нямеччынай. Прадугледжана, аднак, што звароты банку будуць вылічацца мільярдамі і нават дзесяткамі мільярдаў долараў.

Праўда, імянітыя заснавальнікі гаворыць, што звышбанк будзе займацца, галоўным чынам, атрыманьнем нямецкіх кантрыбуцыйных плацяжоў і іх разьмеркаваньнем паміж пераможанымі. Аднак, на канфэрэнцыі, якая цяпер засядае ў Бадэн-Бадэне, гутарка ідзе ўжо аб тым, каб ускласьці на звышбанк і іншыя задачы. Мяркуецца абярнуць яго ў таварыства ўзаемнага страхаваньня капіталістычных дзяржаў ад фінансавых катастроф, ад абясьцэньваньня трошай (інфляцыя) у выпадку гаспадарчай разрухі, а таксама эканамічных вынікаў сацыяльных сутычак.

У такім выглядзе звышбанк ужо набывае значэньне вялічэзнага фінансавага інтэрнацыяналу, які ствараецца клясай капіталістых у мэтах задушэньня рэвалюцыйнага руху працоўных мас.

Але справа ня толькі ў гэтым. Ужо як толькі стала вядома пра арганізацыю звышбанку сярод часткі эўрапейскай і амэрыканскай буржуазіі пачалі гутаркі аб тым, што **ён павінен зрабіцца таксама зброяй фінансавай блокады супроць Савецкага Саюзу.**

Якім чынам? Вельмі проста—шляхам устанаўленьня адзінага кіраўніцтва і аднолькавай установкі большасьці капіталістычных дзяржаў у пытаньні аб разьліках і крэдытаваньні Савецкага Саюзу. Гэта—яўная спроба пасунуленьня на нашу манаполію замежнага гандлю, спроба ажыцьцяўленьня блокады СССР.

ШТО ДАСЬЦЬ ПЯЦІГОДКА ВЯЛІКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РАБОТ

„Краіна Саветаў" над Аляскай

Да пералёту „КРАІНЫ САВЕТАЎ"

НЬЮ-ЁРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як перадаюць з Сіэтлю, паведамленьне «Асошыэйтэд Прэс» аб тым, што самалёт «Страна Советов» зрабіў у чацьвер вымушаную пасадку ў раёне вадападу на высьпе Дол (Аляска), было атрымана ў Сіэтлі ў пятніцу ў той момант, калі вартавое судно «Гайда» рыхтавалася да пошукаў самалёту. Самалёт «Страна Советов» спусьціўся на выспу Дол а 8-й гадз. 30 хв., менш чым праз 2 гадзіны пасьля аддёту з Сіткі. Спусьціцца ў раёне вадападу было вельмі цяжка. З Сіэтлю адпраўлен на месца пасадкі самалёту новы левы матор.

ВАШЫНГТОН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Берагавая ахова ў Сіэтлі пацьвярджае, што Шастакоў і Стэрлігаў прыбылі ў Грэг (на высьпе Прынца Уэльскага). Увесь экіпаж самалёту цэлы. Берагавое вартавое судна «Ойгам», якое раней шукала «Страну Советов», атрымала загад адправіцца на месца пасадкі самалёту і аказаць яму магчымую дапамогу. У Вашынгтоне лічаць, што «Ойгам» зможа даставіць новы матор з Кечыкану на Алясцы да вадападу, або ў Грэг пасьля таго, як матор прыбудзе ў Кечыкан на параходзе з Сіэтлю. Падарожжа з Сіэтлю ў Кечыкан па параходзе звычайна працягваецца цаўтара дні. Грэг—невялічкае рыбацкае паселішча, населенае галоўным чынам і індыйцамі. Надвор'е ў гэты час сам звычайна бывае добрае.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Увязаць ачышчэньне партыі ад клясава-чужых элемэнтаў з вярбоўкай у яе рады перадавых пралетарскіх кадраў

Бяз гэтага задачы чысткі будуць змазаны, задача ўмацаваньня клясавай баяздольнасьці партыі будзе ня выкананa

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АК КП(б)Б

Аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу арганізацыі

Пастановы чэрвеньскага пленуму Мен. АК КП(б)Б аб узмацненьні тэмпу росту арганізацыі за лік рабочых і батракоў ня выконваюцца

Раённыя камітэты партыі і ячэйкі фармальна адносяцца да выкананьня адказьнейшай палітычнай задачы

Пленум заслухаў даклад тав. **Карана** аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу **Менскай** партыйнай арганізацыі.

— XII зьезд КП(б)Б,—сказаў т. Каран,—высунуў перад **Менскай** арганізацыяй адказную палітычную задачу. **Рост Менскай арганізацыі павінен адбывацца на 90 проц. за лік рабочых ад варштату, батракоў і сельгасрабочых.** Чэрвеньскі пленум Менскага АК КП(б)Б таксама завастрыў увагу арганізацыі на **практычным ажыцьцяўленьні гэтае задачы і ўхваліў рад канкрэтных пастаноў па ўзмацненьні росту арганізацыі за лік рабочых і работніц з вытворчасьці, батракоў і сельгасрабочых.**

Як на практыцы выконвае арганізацыя гэтыя дырэктывы? Лічбы і дынаміка росту арганізацыі сьведчаць аб тым, што дырэктыва XII зьезду КП(б)Б і пастановы Чэрвеньскага пленуму Менаакругкому **ня выконваюцца.** Выпікі росту і рэгуляваньня сацыяльнага складу Менскай арганізацыі за пэрыяд з 1-X 1928 г. па першае кастрычніка 1929 г. сыгналізуюць аб сур'ёзных і небясьпечных правалах у вярбоўцы ў рады партыі рабочых ад варштату і сельгасрабочых. Агульная лічба прынятых у партыю зьмешылася на 91 чал. Калі ў 27-28 годзе ў арганізацыю было прынята звыш 1.700 чалавек, дык на 1-га кастрычніка 1929 г. у арганізацыю прынята ўсяго 1.622.

Жорстка рэгулюючы сацыяльны склад арганізацыі, мы дабіліся павялічэньня проценту рабочых ад варштату і зьмяншэньня проценту служачых і іншых. Прыцёк у партыю служачых зьмешыўся з 7,2 проц. да 3 проц. Колькасьць іншых дае зьніжэньне з 1,1 проц. да 0,2 проц. Побач з гэтым мы маем пэўнае павялічэньне рабочага ядра ў арганізацыі. Але трэба адзначыць, што гэтае павялічэньне тлумачыцца не паляпшэньнем масавай, палітычна - выхаваўчай работы, не ўзмацненьнем індывідуальнай і групавой агітацыі і прапагандысцкай работы, а тым, што мы зьменшылі прыём у арганізацыю служачых і іншых. Толькі таму, што мы спынілі прыём у партыю непралетарскіх элемэнтаў, процант рабочых ад варштату даў павялічэньне. Але дынаміка росту арганізацыі за лік рабочых ад варштату далёка не адпавядае тым палітычным задачам, якія высунуў перад Менскай арганізацыяй XII партыйны зьезд.

У першым квартале процант рабочых ад варштату складаў да агульнае колькасьці прынятых у партыю толькі 44. У другім квартале гэта лічба павялічылася да 73,4 проц. У III квартале мы амаль дасягнулі тэй лічбы, якую высунуў перад Менскай арганізацыяй XII зьезд КП(б)Б. Процант рабочых ад варштату, прынятых у партыю ў III квартале, складае 85,3. Сярэдні процант за год дасягае 64 проц. Зразумела, што рост арганізацыі пры такім тэмпе праходзіць марудна і зусім не адпавядае дырэктывам XII партыйнага зьезду. Той факт, што замест 90 проц. росту за лік рабочых ад варштату і сельгасрабочых арганізацыя выканала яго толькі на 64 проц., зьяўляецца вялікім палітычным мінусам у рабоце Менскай арганізацыі КП(б)Б. Нельга не адзначыць, што ў параўнаньні з мінулым годам агульная колькасьць прынятых у партыю рабочых, батракоў і сельгасрабочых зьмешылася. На 1-X 28 году Менская арганізацыя прыняла ў партыю 1.070 рабочых ад варштату, батракоў і сельгасрабочых, а на першае кастрычніка 1929 г. — толькі 1.040.

Такое становішча стварае сур'ёзную небясьпеку невыкананьня дырэктыў XII зьезду КП(б)Б і верасьнёўскага пленуму Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б аб росьце Менскай партыйнай арганізацыі на 90 проц. за лік рабочых ад варштату і батракоў.

Раённыя камітэты партыі і ячэйкі спакойна праходзяць міма гэтых трывожных фактаў. Райкомы праяўляюць кансэрватызм, павярхоўнасьць, фармальныя адносіны да пытаньняў вярбоўкі ў партыю рабочых і сельгасрабочых і работніц. **Астрашыцка - Гарадзецкі, Халопеніцкі і Лагойскі** камітэты КП(б)Б за год ніводнага разу не абмяркоўвалі пытаньня аб росьце партыі. Ня дзіва, што рост гэтых арганізацый праходзіць марудна. **Халопеніцкая** партарганізацыя прыняла за год 8 чалавек, **Астрашыцка-Гарадзецкая — 9, Бягомльская — 13** і г. д.

Культурна - выхаваўчая, масавая работа, палітычная агітацыя і г. д. сярод асноўных кадраў рабочых мас, батрацтва, сельгасрабочых, калгасьнікаў і камунараў праводзіцца невыстарчальна. І таму пры наяўнасьці вялізарных кадраў для росту арганізацыі мы маем у наяўнасьці мізэрную партыйную праслойку сярод саўгасных рабочых, калгасьнікаў і камунараў.

У акрузе магутным тэмпам разгортваецца калгаснае будаўніцтва. Будуюцца вялікія калгасы і камуны, расьце армія калгасьнікаў і камунараў. А як абстаіць справа з уцягненьнем лепшых калгасьнікаў - беднякоў у рады партыі? Адказам на гэта пытаньне могуць служыць наступныя лічбы. У акрузе на 1-X 29 г. налічваецца 220 калгасаў, 15 камун і каля 200 вытворчых аб'яднаньняў, якія ахапляюць звыш 2.000 беднякоў і батракоў. Камуністых сярод калгасьнікаў і камунараў налічваецца ўсяго 59 чалавек.

Зусім слабая і няпрыкметная партыйная праслойка і сярод саўгасных рабочых. Саўгасы зьяўляюцца асноўнай крыніцай для росту арганізацыі на вёсцы. Аднак, партыйныя ячэйкі ня ўлічваюць гэта і не праводзяць масавай палітычнай работы сярод саўгасных рабочых. Партыраслойка ў саўгасах акругі складае ўсяго 18 проц. На 1.500 сталых сельгасрабочых, што працуюць у савецкіх гаспадарках, налічваецца ўсяго 340 партыйцаў. Адначасова арганізацыя невыстарчальна расьце за лік с.-г. работніц і батрачак. На гэты вучастак работы мы павінны накіраваць усе нашы сілы. Паляпшаючы работу дэлегацкіх сходаў, набліжаючы батрачак і сельгасработніц да грамадзкай работы і штодзённага жыцьця парт'ячэек, знаёмячы батрачак і работніц з важнейшымі гаспадарча - палітычнымі пытаньнямі, мы павінны выканаць дырэктыву партыі аб сталай і сыстэматычнай вярбоўцы ў партыю перадавых бяднячак - калгасьніц, батрачак і сельгасрабочых.

Вытворчыя парткалектывы і гарадзкія райкомы КП(б)Б таксама не разгарнулі сыстэматычнай работы па вярбоўцы ў КП(б)Б рабочых ад варштату і работніц. На буйнейшых менскіх прадпрыемствах партпраслойка яшчэ зусім слабая. На фабрыцы **«Меншвэй»** партпраслойка складае ўсяго 21 проц., на заводзе **«Энэргія»** таксама; на 2.200 рабочых-чыгуначнікаў МББ чыгункі налічваецца ўсяго 530 партыйцаў. Вытворчыя калектывы Барысава па прыкладзе Менску таксама слаба праводзяць масавую работу з беспартыйнымі рабочымі і работніцамі. І таму партпраслойка на барысаўскіх прадпрыемствах зьяўляецца невыстарчальнай. На фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** партпраслойка складае ўсяго 16 проц.

Парткалектывы ня прыцягваюць рабочую масу да актыўнай грамадзкай работы, не мабілізуюць беспартыйных рабочых і работніц для ўдзелу ў штодзённай рабоце партыі, ня ўвязваюць масавую работу з важнейшымі палітычнымі задачамі — сацыялістычнае спаборніцтва, бесьперапынны рабочы тыдзень і г. д. Замест гэтага шмат якія калектывы праводзяць трафарэтныя мітынговыя сходы, ня цікавыя, шаблённыя даклады і г. д. Замест вырашэньня прынцыповых пытаньняў, калектывы займаюцца дробязнымі дзяляцкімі справамі і г. д. Так было, напрыклад, на буйнейшым прамысловым прадпрыемстве — гарбарні **«Бальшавік».** Парткалектыў «Бальшавіка» за апошнія месяцы зусім не расьце таму, што масавая работа знаходзіцца ў заняпадзе. Калектыў займаецца вырашэньнем дробязных спраў, прасякнутых беспрынцыповым дзяляцтвам замест Гдзёвага выхаваньня камуністых і беспартыйных рабочых.

Партарганізацыя навінна бездакладна дабіцца рашучага пералому ў разгортваньні культурна - выхаваўчай масавай работы на прадпрыемстве. Цэнтр гэтае работы павінен быць перанесены ў цэх, у самую гушчу рабочых мас.

Дакладчык і прамоўцы, што выступалі ў спрэчках, завастрылі ўвагу пленуму і на такім небясьпечным факце, як зьмяншэньне росту партыйнай арганізацыі за лік камсамольцаў - рабочых ад варштату, батракоў і сельгасрабочых. Колькасьць камсамольцаў, прынятых у партыю, зьменшылася на 10 проц. Гэты недахоп павінен быць выпраўлены. Арганізацыя павінна ўзмацніць тэмп росту за лік перадавых камсамольцаў—рабочых ад варштату, батракоў і сельгасрабочых.

Потым тав. **Каран** спыніўся на пытаньнях работы з кандыдатамі, адзначыўшы неабходнасьць сталай работы па палітычным выхаваньні кандыдацкіх кадраў арганізацыі.

Абгаварэньне дакладу тав. Карана прайшло пад знакам шырокай актыўнасьці. Удзельнікі пленуму падкрэсьлілі, што асноўнай і першачарговай задачай арганізацыі зьяўляецца сыстэматычная вярбоўка ў партыю перадавых рабочых, батракоў і сельгасрабочых.

Дырэктыва XII зьезду КП(б)Б аб узмацненьні росту арганізацыі за лік пралетарскіх кадраў павінна быць выканана—над такім лёзунгам праходзіць работа пленуму.

***

Пленум заслухаў інфармацыю тав. **Дамброўскага** аб чыстцы партыі і даклад тав. **Цэнцыпэра** аб партыйнай асьвеце.

Не дазволім апаганьваць задачы праверкі

(Ячэйка КП(б)Б пры працалектыве «Бюро даручэньняў», Менск)

Праверка нашай ячэйкі распачалася з 5-га кастрычніка і цягнулася некалькі дзён. Да чысткі парт'ячэйкай была праведзена падрыхтоўчая работа, усе супрацоўнікі-латочнікі своячасова былі азнаёмлены з мэтамі і задачамі чысткі.

На першым праверачным сходзе пасьля заслуханьня справаздачы сакратара ячэйкі аб рабоце бюро і стане ячэйкі шырока разгарнуліся спрэчкі, у якіх прысутныя прынялі актыўны ўдзел.

Як станоўчы момант, было адзначана, што за час існаваньня ячэйкі, апошняя выкрыла ўсе тыя агідныя зьявішчы, якія рабіліся ў працалектыве «Белпосередник». Ячэйка пабальшавіцку выкараніла «ракаўшчыну» з нашае ўстановы.

Ячэйка павольным тэмпам выконвала пастановы кантрольных органаў па пытаньні ўрэгуляваньня зарплаты сярод латочнікаў.

Былі і адмоўныя моманты ў рабоце. Слаба была разгорнута палітычна-выхаваўчая работа сярод супрацоўнікаў калектыву, у асаблівасьці сярод латочнікаў. Не зьвярталася досыць увагі з боку ячэйкі на кіраўніцтва мясцкомам.

У часе праверкі кожнага члена партыі (іх у нас 7 чал.) беспартыйныя прынялі актыўны ўдзел, гаварылі аб станоўчых і адмоўных бакох работы.

Былі спробы з боку некаторых «пакрыўджаных» выкарыстаць чыстку ў сваіх асабістых інтарэсах, скампрамэтаваць ячэйку. Так, былы загадчык тутэйшай базай Гурвіч (зараз звольнены) прышоў на праверачны сход з намерам падарваць аўтарытэт парт'ячэйкі і некаторых партыйцаў. Але з боку праверкому і сходу Гурвіч быў выкрыты. На сходзе было канстатавана, што ў часе агульнага сходу, скліканага РСІ, Гурвіч прабаваў замазаць сутнасьць непрадпрадкаў, якія рабіліся ў «Белпосереднике», і ён атрымаў тады належны адпор. Латочнікі-беднякі на сходзе заявілі, што за час існаваньня ячэйкі ўрэгулявана самае балючае пытаньне — зарплата. Цяперашні латочнік-бядняк, які да таго, пакуль ня была выкрыта «ракаўшчына», выраблялі 20-30 руб. у месяц, зараз заробляе ад 70 да 80 руб.

Бальшавіцкі адпор атрымаў і трацкісты Дунскі, які прабаваў скампрамэтаваць ячэйку і навязаць свае трацкісцкія погляды прысутным.

РАШАЛЬ і ПЭРЭЛЬМАН.

Рыхтуемся да чысткі

(Ячэйка КП(б)Б камгасу, Менск)

Партячэйка камгасу абслугоўвае рад устаноў і прадпрыемстваў, якія налічваюць больш за 500 чал.

На ўсіх прадпрыемствах і ўстановах і калектывах рабочых і служачых устанавілі дзяжурствы членаў брыгады, якія кожны дзень прымаюць пісьмовыя і вусныя заявы аб рабоце ячэйкі і асобных камуністых.

Ячэйка правяла рад сходаў, на якіх члены бюро ячэйкі, брыгадзіры выступалі з дакладамі аб палітычных задачах і значэньні чысткі партыі.

Насьценныя газэты адвялі шмат месца пытаньням чысткі. 16-га кастрычніка ў клюбе будаўнікоў мае адбыцца справаздача бюро парт'ячэйкі перад партыйнай і беспартыйнай масай, якую абслугоўвае ячэйка.

На ўсіх прадпрыемствах ужо вывешаны скрынкі для збораў заяў на партыйцаў і заўваг аб рабоце ячэйкі.

Сярод мас адчуваецца вялікая задакаўленасьць падрыхтоўкай да чысткі.

ЗАЛЬЦМАН

ПРАВЕРКА ПАВІННА ЗРАБІЦЬ ПЕРАЛОМ

У справе разгортваньня самакрытыкі

Парт'ячэйка парсувязі (Менск) пачала правярацца з 5-га кастрычніка. Да гэтага часу яна правяла адпаведную падрыхтоўку і таму на першым праверачным сходзе прысутнічала больш за 200 чалавек партыйцаў, беспартыйных працаўнікоў сувязі, партыйцаў і беспартыйных рабочых чыгуначнікаў, якія прымаданы на час чысткі да нашай ячэйкі. На працягу тыдня перад пачаткам чысткі ў клюбе дзяжурыў брыгадзір, які прымаў заявы на асобных партыйцаў, праз гутаркі знаёміўся з работай ячэйкі. У мінулым у рабоце нашай ячэйкі былі недапушчальныя моманты. [illegible] ўзялося за работу, у [illegible]дку самаачышчэньня выключыла некалькіх чалавек з партыі, узялося за наладжаньне работы грамадзкіх арганізацый.

Самакрытыка сярод беспартыйных яшчэ не ўкаранілася, як галоўны мэтад выпраўленьня памылак і недахопаў у рабоце розных арганізацый.

Праверка і чыстка парт'ячэйкі павінна зьявіцца пераломным момантам у бок шырокага разгортваньня самакрытыкі. Праверачная камісія прыступіла ўжо да пэрсанальнай праверкі членаў і [illegible] на праявіўся 100-процантны бюракратызм, ігнараваньне нізоў.

Зараз пяройдзем да абгаварэньня асобных пунктаў праекту.

Нельга пярэчыць супроць таго пункту, што першапачатковымі вытворчымі аб'яднаньнямі павінны быць аб'яднаньні пасёлкавага тыпу з ухілам у залежнасьці ад асноўнай галіны сельскае гаспадаркі і міжпасёлкавыя спэцыяльныя віды вытворчых аб'яднаньняў.

Тут толькі напрашваецца пытаньне аб колькасьці двароў, патрэбных для юрыдычнага афармленьня статутаў аб'яднаньняў і аб раёне дзейнасьці іх.

Колькасьць двароў трэба ўстанавіць у 15 адзінак, бо ўстанаўленьне большага ліку двароў створыць рагатку перад бяднякамі гаспадаркамі, якія будуць залежаць [illegible]

Задача раённага саюзу—кіраваць і кантраляваць дзейнасьць асобных вытворчых аб'яднаньняў, плянава забясьпечваць іх сродкамі вытворчасьці, арганізоўваць збыт сельска-гаспадарчай прадукцыі на аснове кантрактацыйных даговараў.

Замест існуючых сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў у цэнтры раёну арганізуецца раённае крэдытнае таварыства, якое не займаецца ніякімі функцыямі збыту і забясьпячэньня і ў задачы якога ўваходзіць мабілізацыя сродкаў насельніцтва, фінансаваньне вытворчых працэсаў, збыт, забясьпячэньне і хаваньне сродкаў раённага бюджэту. Такім чынам, крэдытнае таварыства становіцца крэдытна-плянавым фінансавым цэнтрам раёну.

Рыбаводныя таварыствы, якія павінны займацца ня толькі эксплёатацыяй вазёр, але арганізацыяй рыбнай гаспадаркі, трэба пакінуць, як самастойныя віды вытворчае каапэрацыі.

Неабходна ліквідаваць акруговыя саюзы сельска-гаспадарчай каапэрацыі і стварыць замест іх інстытут упаўнаважаных цэнтральных саюзаў і сельска-гаспадарчага банку са штатам інструктароў.

У рэспубліканскім цэнтры трэба арганізаваць спэцыяльныя саюзы па паасобных відах сельска-гаспадарчай вытворчасьці, с.-г. банк і беларускае аддзяленьне акцыянэрнага таварыства сельска-гаспадарчага забясьпячэньня.

П. СОКАЛАЎ.

Што прапануюць полацкія каапэратары

Рэарганізацыя сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі дыктуецца самім жыцьцём. Хуткі тэмп сацыялістычнае рэканструкцыі ставіць перад сыстэмай сельска гаспадарчай каапэрацыю задачу найшырэйшага вытворчага каапэраваньня вёскі і калектывізацыі раздробленых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Існуючы універсалізм крэдытных таварыстваў не дае магчымасьці як належыць абслугоўваць працэсы сацыялістычнае рэканструкцыі.

Але ўся рэарганізацыя дагэтуль праводзілася габінэтным парадкам бяз шырокага ўдзелу нізавой сеткі каапэрацыі. Вось прыклады. Полацкі Сельсаюз 16 жніўня атрымаў праект Белсельсаюзу з прапановаю да 20-га жніўня выказаць свае меркаваньні, а пляндавая камісія прыслала свой праект з прапановай ў перад бяднякамі гаспадаркамі вёскі, [illegible]

Што-ж датычыць раёну дзейнасьці пасёлку ў адносінах ахопу двароў, дык трэба ўстанавіць ня менш 60 двароў, бо ў іншым выпадку вёска будзе раздрабляцца на маленькія пасёлкі.

Тав. **Дубіна** ў сваім артыкуле паконт рэарганізацыі зусім ня спыніўся на пытаньні аб кулаку. Мне здаецца, нельга ўцягваць кулацкія гаспадаркі ў першапачатковыя аб'яднаньні.

Нельга перадаваць рыбныя арцелі саматужна - прамысловай каапэрацыі. **Я раіў-бы арганізаваць беларускі рыбны сындыкат.** На мае сэнсу арганізоўваць спэцыяльныя мэліярацыйныя таварыствы, бо праз 2-3 гады яны ўсё роўна павінны рэарганізавацца ў калгасы ці пасёлак.

Трэба [illegible]

Да пераліту „КРАІНЫ САВЕТАЎ"

НЬЮ-ЁРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як перадаюць з Сіэтлю, паведамленьне «Асошыэйтэд Прэс» аб тым, што самалёт «Страна Советов» зрабіў у чацьвер вымушаную пасадку ў раёне вадападу на высьпе Дол (Аляска), было атрымана ў Сіэтлі ў пятніцу ў той момант, калі вартавое судно «Гайда» рыхтавалася да пошукаў самалёту. Самалёт «Страна Советов» спусьціўся на выспу Дол а 8-й гадз. 30 хв., менш чым праз 2 гадзіны пасьля аддёту з Сіткі. Спусьціцца ў раёне вадападу было вельмі цяжка. З Сіэтлю адпраўлен на месца пасадкі самалёту новы левы матор.

ВАШЫНГТОН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Берагавая ахова ў Сіэтлі пацьвярджае, што Шастакоў і Стэрлігаў прыбылі ў Грэг (на высьпе Прынца Уэльскага). Увесь экіпаж самалёту цэлы. Берагавое вартавое судна «Ойгам», якое раней шукала «Страну Советов», атрымала загад адправіцца на месца пасадкі самалёту і аказаць яму магчымую дапамогу. У Вашынгтоне лічаць, што «Ойгам» зможа даставіць новы матор з Кечыкану на Алясцы да вадападу, або ў Грэг пасьля таго, як матор прыбудзе ў Кечыкан на параходзе з Сіэтлю. Падарожжа з Сіэтлю ў Кечыкан па параходзе звычайна працягваецца цаўтара дні. Грэг—невялічкае рыбацкае паселішча, населенае галоўным чынам і індыйцамі. Надвор'е ў гэты час сам звычайна бывае добрае.

Па Савецкім Саюзе

2½ мільярды на сельскую гаспадарку

МАГУТНАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ АБАГУЛЕНАМУ СЭКТАРУ

Па пярэдніх даных Наркамфіну СССР, абхват фінансаваньня сельскай гаспадаркі ў 1929-30 годзе складае каля 2,6 млрд. руб. супроць 1,4 млрд. руб. у мінулым 1928-29 г. (прырост у 85 проц.). Па пяцігодцы ў 1929-30 г. прадбачыліся ўклады ў сельскую гаспадарку ў разьмеры толькі 1,8 млрд. руб.

Па адзіным дзяржбюджэце на фінансаваньне сельскай гаспадаркі асыгнуецца 866 млн. руб. супроць 334 мільёнаў р. у 1928-29 годзе (прырост на 80 проц.). Апошняя сума складаецца з уласных сродкаў насельніцтва (калгасаў), арганізацый (Галоўхлопком, Цукратрэст і інш.), сыстэмы сельгаскрэдыту, мясцэвага бюджэту і г. д.

Асыгнаваньні на абагулены сэктар займаюць у фінансаваньні сельскай гаспадаркі на 1929-30 г. пераважнае месца і значна перавышаюць асыгнаваньні 1928-29 г. і намечаныя пяцігодкай тэмпы. Так, напрыклад, на фінансаваньне зернявых саўгасаў адпускаецца ў гэтым годзе 170 млн. руб. (супроць 62 млн. руб. у мінулым годзе), на фінансаваньне трэставых саўгасаў—101,2 млн. (у мінулым годзе—20 млн. руб.), на крэдытаваньне калгасаў—50 млн. руб. (у мінулым годзе 20 млн. руб.), на фінансаваньне машына-трактарных станцый — 30 млн. руб. (у мінулым годзе—нічога) і г. д.

Пэрспэктывы савецкага гукавога кіно

ЛЕНІНГРАД, 8. Аб далейшых пэрспэктывах савецкага гукавога кіно яго вынаходнік інжынэр Шорын у гутарцы з супрацоўнікамі газэт сказаў: «Першую практыку гукавога кіно ў Ленінградзе трэба прызнаць зусім удалай. Наша прамысловасьць можа забясьпечыць кінаарганізацыі ўсім патрэбным матар'ялам для здымкаў савецкіх гукавых карцін. Мы можам сьмела стаць побач з замежным гукавым кінэматографам, тым больш, што зробленыя ў адным з нямецкіх кінэ пробы гукавога фільму савецкае вытворчасьці паказалі, што наш гукавы фільм па якасьці ня ўступае замежнаму. У бліжэйшы час трэст заводаў слабога току супольна з Саўкіно зможа адкрыць ва многіх гарадох Саюзу кіно, дзе будуць дэманстравацца першыя гукавыя фільмы. Мы ўжо правялі работу па наданьні тукаў ужо гатоваму фільму «Бабы Разанскія». Музыка для гэтага фільму напісана кампазытарам Пашчэнкам. Зараз Саўкіно ўжо вылучыла рэжысэраў, якія выдуць здымкі новай гукавой карціны «Пяцігодка». У хуткім часе адкрываецца студыя, абсталяваная для гукавога кіно. У бліжэйшыя два-тры гады будзе выпушчана гукавых фільмаў на 100.000.000 руб.

Брудная авантура растратчыка Бесядоўскага

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ПОЎНАМОЦНАГА ПРАДСТАЎНІЦТВА СССР У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 5. Учора поўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Францыі паведаміла французкаму міністру замежных спраў, што Бесядоўскі зьняты з пасады дарадцы пасольства, і папрасіла міністэрства замежных спраў выкрасьліць яго імя са сьпіс дыпляматычнага корпусу. (ТАСС).

***

ПАРЫЖ, 4. (ТАСС). Поўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Парыжы перадало ў друк для апублікаваньня наступнае паведамленьне:

«Былы дарадца пасольства Бесядоўскі, які з некаторага часу жыў зусім не паводле сваіх сродкаў, растраціў з даручаных яму фондаў значную суму, аб якой ён ня мог даць справаздачы. 24-га верасьня г. г. Народны Камісарыят па замежных справах запрапанаваў Бесядоўскаму зьявіць з сябе выкананьне абавязкаў і выехаць у Маскву для дачы тлумачэньняў.

З прычыны таго, што Бесядоўскі не падпарадкаваўся гэтаму распараджэньню члену калегіі Народнага камісарыяту рабоча-сялянскай інспэкцыі, было даручана спраўдзіць справаздачнасьць б. дарадцы пасольства. Для гэтай мэты член калегіі Народнага камісарыяту рабоча-сялянскай інспэкцыі Ройзэман прыехаў у Парыж 2-га кастрычніка. Жадаючы ўнікнуць справаздачы, а галоўным чынам, ухіліцца ад адказнасьці за свае дзеяньні, Бесядоўскі манлівым чынам пакінуў пасольства. Для таго, каб увесьці грамадзкую думку ў заблуджэньне Бесядоўскі прабаваў ілжывым чынам надаць справе, якая зьяўляецца чыста крымінальнай, палітычны характар, якога справа ні ў якім выпадку ня мае, і пад выглядам нібы палітычных разыходжаньняў з яго ўрадам паказаць сабе, як ахвяру сваіх перакананьняў. Пасольства сьцьвярджае самым катэгарычным чынам, што ніколі Бесядоўскі не заяўляў аб сваіх разыходжаньнях у поглядах з урадам ні ўраду, ні пасольству. З другога боку, спадзяючыся пры дапамозе скандалу адцягнуць увагу ад сваіх благіх учынкаў, ён выдумаў байку, быццам яго сям'я і ён сам былі затрыманы ў пасольстве і быццам іх жыцьцю пагражалі, што пабудзіла яго патрабаваць умяшальнасьці французкай паліцыі. Даводзячы да ведама грамадзкае думкі пра факты, выстарчальныя для характарыстыкі чалавека, які ад ціперашняга часу падлягае крымінальнай адказнасьці, пасольства самым фармальным чынам абвяргае ўсе фантастычныя цьверджаньні, якія маглі зьявіцца з гэтае прычыны».

У панядзелак, 14 кастрычніка, у Доме камасьветы імя Карла Маркса, а 8 гадз. увечары адбудзецца вечар актыву вытворчых ячэек Менскай арганізацыі, (партыйнага, камсамольскага і беспартыйнагаактыву). Даклад намесьніка старшыні ВСНГБ т. Стракоўскага аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва ў прамысловасьці БССР і далейшых задачах.—Пасьля дакладу канцэртнае аддзяленьне. Прадстаўнікоў ячэек зьявіцца за білетамі ў Дом камасьветы: Фрунзэўскаму РК—10-га, Кастрычніцкаму РК 11-га кастрычніка з 11 да 3 гадз. дня і ад 6 да 9 г.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

рабселькораў і рэдкалегій насьценгазэт

праводзіцца ў рэдакцыі газ. «Зьвязда»

штодзённа ад 2-х да 4-х гадз дня, па серадах і пятніцах ад 6-ці да 8 гадзін увечары.

Масавы аддзел газэты «Зьвязда».

Па савецкай Беларусі



Новапабудаваная цагельня ў Гомелі

У дні яўрэйскага сьвята ўсе рабочыя вышлі на работу

Заработак адлічаны ў фонд індустрыялізацыі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У дні яўрэйскіх сьвят **«Рош Гашона»** ўсе яўрэйскія рабочыя на буйных прадпрыемствах вышлі на працу. Працавалі нават тыя, хто ў мінулыя гады ня выходзіў на работу. Працавалі звычайным парадкам і арцелі. Толькі ў арцелі «Чырвоны Ткач» ня вышлі на работу 5 чалавек. Многія арцелі працавалі ў фонд індустрыялізацыі краіны.

БАРЫСАЎ (Наш рабкор). Усе рабочыя-яўрэі фабрыкі «Прафінтэрн» працавалі ў дні «Рош Гашона». На агульным сходзе пастаноўлена адмовіцца ад сьвяткаваньня ўсіх яўрэйскіх рэлігійных сьвят і адлічыць зарплату за 2 гадзіны працы на пабудову самалёту «Біра-Біджан».

Пушчана новая цагельня

Гадавая прадукцыйнасьць—7 міл. штук цэглы

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). З 1-га кастрычніка пушчана новая цагельня прамкамтрэсту, пабудаваная на працягу гэтага лета. Гадавая прадукцыйнасьць цагельні, пры поўнай нагрузцы, каля 7 мільёнаў штук цэглы. Завод будзе працаваць круглы год і ўжо да канца будаўнічага сэзону дасьць 3 мільёны штук цэглы. Завод яшчэ не мэханізаваны; мэханізацыя яго па пляне прадугледжана на працягу 1930-31 г. г.

Пуск цагельні зьяўляецца значным укладам у прамысловасьць Полаччыны і вялікай дапамогай у выкананьні нашага будаўніцтва, бо ў мінулыя гады валавая прадукцыя цагелень прамкамтрэсту раўнялася 4 міл. штук цэглы, а зараз—10 міл.

Сабекошт цэглы з пускам цагельні зьнізіўся з 36 руб. за 1 тысячу штук да 27 рублёў, а прадажная цана—з 35 рублёў да 28 рублёў (з 1-га кастрычніка г. г.), ці на 20 проц. Будаўнічыя арганізацыі змогуць з'эканоміць на цэгле 70 тысяч рублёў у год.

За адзін год будаўніцтва ў нас разгорнута такім тэмпам, якога Полацак ня бачыў дзесяткі гадоў.

І. КАРАНДЗЕЙ

За простой вагонаў--да адказнасьці

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Праўленьне Заходніх чыгунак паведаміла Наркамгандаль, што ў надзелю, 6-га кастрычніка, у Гомелі работа па выгрузцы тавараў не праводзілася.

Ня гледзячы на перапоўненыя пакгаузы, гаспадарчыя арганізацыі не выгружалі тавараў быццам з-за недахопу падвод. Між тым, на станцыю сялянамі было прывезена некалькі вагонаў яблык і сялянскія вазы маглі быць скарыстаны для выгрузкі тавараў.

Наркамгандаль прапанаваў акрганцлю вызваліць вінаватых у прастоі вагонаў і прыцягнуць іх да адказнасьці.

Сельска-гаспадарчыя выстаўкі на Барысаўшчыне

БАРЫСАЎ (Наш кар.). Па сельсаветах Барысаўскага раёну адкрыліся сельска-гаспадарчыя выстаўкі, на якіх будуць падведзены вынікі дасягненьняў па сельскай гаспадарцы ў кожным сельсавеце. Для правядзеньня выставак мабілізаваны ўсе вгранамічныя сілы саўгасаў, школ сялянскае моладзі с.-г. тэхнікуму і г. д.

Для ўдзелу ў выстаўцы шэфтаварыства камандыравала рабочыя брыгады па сельсаветах.

Лепшыя экспанаты з выставак будуць прадстаўлены на раённую с.-г. выстаўку.

Ініцыятыва мас у паляпшэньні пажарнай аховы вёскі

ВОРША. (Наш кар.). Пажарныя дружыны раду вёсак Копыскага раёну, па ініцыятыве саміх пажарнікаў, пастанавілі нагрузіць 240 вагонаў балястам, а ўвесь заработак аддаць на паляпшэньне пажарнай аховы вёсак, на куплю машын, інвэнтару і г. д. Чыгунка згадзілася з гэтай прапановай, і пажарнікі адгрузілі ўжо 120 вагонаў. Заработак—720 руб.

На нагрузку вагонаў у карысьць пажарнае аховы выходзілі і сяляне непажарнікі.

Да зьезду сельска-гаспадарчай каапэрацыі

Як рэарганізаваць сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі

(У парадку абгаварэньня)

Ліквідаваць акруговыя сельсаюзы

Арганізаваць раённыя крэдытныя таварыствы

Прапановы віцебскіх працаўнікоў

Пытаньне аб рэарганізацыі сыстэмы сельска-гаспадарчае каапэрацыі цікавіць ня толькі каапэрацыйны актыў і каапэрацыйных працаўнікоў, але ўсю савецкую грамадзкасьць. Асабліваё значэньне набывае пытаньне рэарганізацыі для Віцебскае акругі, якая зараз праводзіць карэнную рэарганізацыю савецкага апарату.

Задача рэканструкцыі сельскае гаспадаркі патрабуе прыстасаваньня да сучасных умоў работы сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Калі с.-г. каапэрацыя можа поўнасьцю выканаць свае задачы? Калі каапэрацыйны апарат будзе набліжаны да мас, калі ён будзе фармаваць справу каапэраваньня і калектывізацыі, калі ўсе вольныя сродкі насельніцтва будуць накіраваны на разьвіцьцё вытворчых сіл сельскае гаспадаркі, калі работа апарату будзе рацыяналізавана.

Якой павінна быць сыстэма с.-г. каапэрацыі, каб здавальняць пастаўленым перад ёй задачам.

Акрамя вышэ

УСЯМЕРНА АБСЛУЖЫЦЬ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ

Праверыць, як прыстасавана работа савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый да патрэб калектывізацыі сельскай гаспадаркі

Няпісьменнасьць пагражае справе калектывізацыі

Мы ня можам яшчэ пахваліцца тым, што нашы калгасьнікі па сваім культурным узроўні стаяць значна вышэй за беднякоў і сераднякоў вёскі, а трэба так зрабіць, каб калгасьнікі былі прыкладам для ваколічных вёсак.

У калгасах Аршаншчыны няпісьменнасьць дасягае 50-60 проц., а ў некаторых, як напрыклад, у калгасе «Новы Двор», налічваецца каля 90 проц. няпісьменных.

Інспэктарыяты асьветы як акруговыя, так і раённыя, не зварачалі на гэта ўвагі, а вызначаныя сродкі не скарыстоўваліся. Калі летась па Аршаншчыне было вызначана для гэтай мэты 30 тыс. руб., дык яны ня былі скарыстаны.

Былі і такія недарэчнасьці, калі разам займаліся няпісьменныя і малапісьменныя, а ў выніку малапісьменныя крыху навучыліся, а няпісьменныя так і засталіся няпісьменнымі.

Па калгасах Аршаншчыны налічваецца яшчэ 1.752 чал. няпісьменных. Гэта трэба ўлічыць і на практыцы мінулага году ўнікнуць тых памылак, якія былі зроблены летась.

Нядбайныя адносіны да справы калектывізацыі нагляделіся ня толькі з боку раённых і акруговых арганізацый, але таксама і з боку цэнтральных устаноў.

Цэнтральнае праўленьне т-ва «П. Н.» кіравала толькі шляхам агульных дырэктыў, а таго ня было, каб даць практычныя парады нізавым ячэйкам, як праводзіць ліквідацыю няпісьменнасьці. Акруговыя таварыствы, атрымаўшы дырэктыву, клалі яе пад сукно, і далей яна ня бачыла сьвету. Калгассаюз таксама адмаўляецца ад гэтае справы. Ён адказвае: ліквідуйце, гэта не мая справа.

Трэба яшчэ адзначыць, як недапушчальнае зьявішча, тое, што калгасы да гэтага часу не забясьпечаны бібліятэкамі. У большасьці выпадкаў калгасы ня маюць сваіх хатчыталень, а гэта ўсё адбіваецца на пасьпяховым разьвіцьці калгаснага руху.

Селянін Патрок Сілкін актывіст, першы уступіў у калгас «Камунары» (на Магілеўшчыне)

Праваліліся кулацкія спробы разбурыць калгас

(Новасёлкаўскі сельсавет, Пухавіцкага раёну)

У першы дзень калектывізацыі з вёскі Лядцо была паслана дэлегацыя з 8 чалавек у калгас «Бальшавік», Самахвалаўскага раёну, налядзець, як жывуць і працуюць калгасьнікі. Пасьля гэтага ў калгас запісаліся 84 гаспадары з 94 двароў вёскі.

Заможнікі павялі агітацыю супроць калгасу з пагрозамі, што «хутка прыдуць белапалякі ды кітайцы, тады кепска вам будзе ў калектыве, вас усіх павешаюць» і г. д. Некаторыя члены калгасу падаліся кулацкай агітацыі, 13 чалавек падалі заявы аб выхадзе з калгасу, а потым зноў 15 чалавек. Кулакі і падкулачнікі в. Лядцо і суседніх пасёлкаў прымалі ўсе меры да таго, каб сарваць работу па калектывізацыі вёскі.

Але ўсе іх спробы разбурыць калгас праваліліся. **У вёску выехала рабочая брыгада, якая 5 верасьня правяла сход беднаты. Зараз настрой калгасьнікаў добры.** 13 чалавек, якія падавалі заявы аб выхадзе з калгасу, зноў уступілі ў калгас. 23 гаспадары ідуць на пасёлкі, а 71—у калгас. Міліцыя прыняла рашучыя меры да тых кулакоў, якія імкнуліся разбурыць калгас.

ЧЫРВОНЫ

Рабочыя брыгады—у вёсках Аршаншчыны

Удзел прафарганізацый у калектывізацыі с. г.

Прафсаюзы Аршаншчыны ня ўсе ў аднолькавай меры прымаюць удзел у калектывізацыі вёскі. **Саюз саўгандальслужачых**, які цесна зьвязаны з вёскай, добра разумеў задачы перабудовы вёскі, ён у часе правядзеньня веснавой і асеньняй сяўбы пасылаў брыгады ў свае падшэфныя сельсаветы, якія рамантавалі сялянам і калгасам машыны, плугі і г. д., зьбіралі попел, арганізоўвалі дапамогу беднаце, праводзілі суботнікі, а на атрыманыя сродкі куплялі машыны і арганізоўвалі пракатныя пункты ў падшэфных сельсаветах. Разам з гэтым сярод сялянства праводзілася і растлумачальная работа па павышэньні ўраджайнасьці і г. д. Брыгады сачылі за тым, каб ня скрыўлялася клясавая лінія, яны правяралі сьпісы сялян, якім патрэбна было насеньне, угнаеньне і крэдыты, каб у гэтыя сьпісы не пападалі кулакі і заможныя. Брыгады арганізоўвалі дапамогу інвалідам вайны і сем'ям чырвонаармейцаў.

Брыгада саюзу саўгандальслужачых наладзіла сацыялістычнае спаборніцтва паміж сваімі падшэфнымі сельсаветамі. Вынікі работы відавочныя. У падшэфных сельсаветах арганізавана некалькі калгасаў.

Саюз працасьветы таксама шмат чаго зрабіў на вёсцы, але яго работа была ня штодзённай і таму вынікаў такіх ня было. Шмат ёсьць і адмоўных бакоў у рабоце саюзаў на вёсцы. Напрыклад, саюз харчавікоў і завод «Спартак» у свае падшэфным сельсавеце праводзіў работу наскокам.

Трэба адзначыць і тое, што шэфы ня мелі цеснай сувязі з беднатой падшэфных сельсаветаў, а толькі з членамі сельсавету, **а ў некаторых выпадках нават гублялі клясавы падыход, напрыклад, плугі рамантавалі толькі тым сялянам, якія маюць коняй**, лічачы, што таму, у каго няма каня, ня трэба рамантаваць плуг, бо ён у яго будзе ляжаць. Попел давалі таксама толькі тым, у каго ёсьць конь, і тым ліку і заможным.

У сучасны момант прафсаюзы Аршаншчыны дзейна рыхтуюцца да дня калектывізацыі і ўраджаю. У вёскі накіраваны рабочыя брыгады ад усіх прафсаюзаў. Брыгады будуць праводзіць растлумачальную работу сярод сялянства.

А. М.

Падрыхтоўку кадраў чырвоных спэцыялістых — у цэнтр увагі ўсёй нашай работы

НКЗ не выкарыстоўвае спэцыялістых

36 проц. выпускнікоў с.-г. акадэміі працуюць па-за межамі БССР

У зьвязку з задачамі пяцігодкі і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі пытаньне аб падрыхтоўцы спэцыялістых у галіне сельскае гаспадаркі набывае актуальнае значэньне. За апошнія 3 гады Беларуская с.-г. акадэмія выпусьціла 540 спэцыялістых. На жаль, акадэмія дала толькі 54 проц. таго ліку спэцыялістых, якіх яна навінна была даць пры нармальных умовах работы. 46 проц. уцечкі—гэта надзвычайна вялікі і зусім ненармальны процант. Як скарыстоўваюцца ў БССР скончыўшыя акадэмію? Прыблізныя лічбы кажуць, што ў іншыя рэспублікі выбыла 36 проц. усяго ліку скончыўшых. Такім чынам, у канчатковым выніку БССР атрымала замест магчымых 100 проц. толькі 28 проц. спэцыялістых сельскае гаспадаркі.

Галоўная прычына недастаткавай прадукцыі акадэміі—гэта адсутнасьць добрападрыхтаваных кадраў для ўкамплектаваньня акадэміі студэнтамі, а ў зьвязку з гэтым, слабая акадэмічная пасьпяховасьць.

Пытаньне аб падрыхтаваных кадрах для ўкамплектаваньня акадэміі—самае балючае пытаньне. Акадэмія навінна камплектавацца за лік рабочых, батракоў і сялян-бяднякоў. Аднак, ва ўсёй сыстэме народнае асьветы БССР адсутнічаюць мерапрыемствы для падрыхтоўкі рабоча-батрацкай моладзі ў ВНУ. Адзіай дробязі ня прадугледзелі працаўнікі Наркамасьветы. Мала адкрыць дзьверы акадэміі для сялянскае беднаты, трэба даць магчымасьць беднаку і калгасьніку падрыхтавацца ў ВНУ.

Другое балючае пытаньне—**жыльлёвы крызыс**, які зараз з адкрыцьцём факультэту буйнае гаспадаркі і павялічэньнем ліку студэнтаў вельмі завастрэцца. З-за недахопу пляшчы і з-за таго, што студэнты і рабфакаўцы па чарзе карыстаюцца табінэтамі і лябараторыямі, студэнту прыходзіцца з самай раніцы да позьняга вечару знаходзіцца на занятках і не застаецца часу для падрыхтоўкі на-даму. Выхад адзін—шырокае жыльлёвае будаўніцтва на тэрыторыі акадэміі, ці перавод рабфаку ў іншае месца.

Вялікая ўцечка выпускнікоў акадэміі за межы БССР тлумачыцца недапушчальна-нядбайнымі адносінамі НКЗ і інш. органаў да справы скарыстаньня спэцыялістых.

А. Чыжэўскі

Падрыхтоўка новых кадраў у Навукова-дасьледчым інстытуце ў Заходняй Асьпіранты палітычна сваба

падрыхтаваны

Што робіць ў справе падрыхтоўкі новых марксыцкіх кадраў навукова-дасьледчы інстытут імя **Леніна?**

Зараз інстытут мае 39 асьпірантаў, з якіх 20 ўжо адбываюць апошні год стажу. Сярод іх — даволі вялікая праслойка вылучэнцаў-рабочых.

Дырэкцыя інстытуту зусім ня была зацікаўлена ў падрыхтоўцы новых кадраў і па працяту ўсёй мінулай зімы палец аб палец ня выцілка, каб узьняць навуковы і палітычны ўзровень асьпірантаў.

Асобныя аддзелы інстытуту зусім не кіравалі падрыхтоўкай.

Колькасьць асьпірантаў павялічваецца з кожным годам. У 1929-30 годзе іх будзе ўжо 54 чал., а ў каштарысе няма ніводнага рубля на падрыхтоўку асьпірантаў. Частка асьпірантаў зьбіралася, нават, уцякаць з інстытуту, бо ня можа сумленны чалавек атрымоўваць дарэмна 120 рублёў, нічога не рабіць і не падрыхтоўвацца да будучай навуковай дзейнасьці.

У далейшым гэткае становішча немагчыма. Трэба прымусіць дырэкцыю НДІ на справе заняцца падрыхтоўкай новых кадраў.

ПРАВАЛ ПРАКТЫКІ НКФ БССР

Падатковае кіраўніцтва замазвала недахопы работы акрфа і тым самым дапамагала правым ухілістым скажаць клясавую лінію, патурала прыватнікам абходзіць савецкія законы і ўхіляцца ад платы падаткаў

У 1928 г. інспэктарам-рэвізорам падатковага кіраўніцтва НКФ была праведзена рэвізія падатковай работы Гомельскага акрфа, таго акрфа, работа якога ўжо ў свой час была добра асьветлена ў друку і добра вядома чытачом па справах Лапірава і інш.

Гэтай рэвізіяй, як кажа акт абсьледваньня, было ўстаноўлена, «што акрфа (зразумела Гомельскі) выпусьціў з сваіх рук справу кіраваньня абкладаньнем самай моцнай верхавіннай групы гандляроў». У выніку мелі месца, як кажа той-жа акт, «1) адвольнае, неўгрунтаванае, а ў шмат якіх выпадках незаконнае вылічэньне зваротаў і даходаў платнікаў, 2) зусім відавочнае недаабкладаньне прыватна-гандлёвага сэктару і вынікам гэтага недабор у карысьць дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў значнай па сваёй велічыні сумы падатковых даходаў». Асабліва важна тут адзначыць тыя абставіны, як кажа акт, што недаабкладаньне галоўным чынам закранула верхавінную частку самай моцнай з пункту гледжаньня інтарэсаў таварнага звароту, самай паразытычнай групы поўгуртавых і гуртавых прадпрыемстваў». Далей акт кажа: «з палічэньнем даходаў самай моцнай групы гандляроў справа абстаіць ня лепш, чым з вылічэньнем іх зваротаў. Ня кажучы ўжо аб тым, што самы факт зьмяншэньня зваротаў у гэтай групы зрабіў адпаведны ўплыў на ўзмацненьне яе даходаў — мы бачым з існуючых матар'ялаў абкладаньня поўнае выкрыўленьне прынцыповай лініі, раз і назаўсёды вызначанай у адносінах падыходу да абкладаньня падаходным падаткам верхавіннай групы гандляроў».

Зрабіць гэткія вывады аб рабоце Гомельскага акрфа рэвізору дазволіў той фактычны матар'ял, які ім складзены на 40 старонках памянёнага вышэй акту.

Але рэвізор, які знайшоў недаабкладаньне буйных гандляроў, памяншэньне ў гэтае групы зваротаў, адсутнасьць кіраваньня падатковай работай з боку акрфа і г. д., на жаль, у гэтым ня ўбачыў выкрыўленьня клясавай лініі, якое бязумоўна было ў наяўнасьці.

Начальнік-жа падатковага кіраўніцтва т. Кардашэнка ў прыведзеных фактах нават ня ўбачыў таго, што ўбачыў рэвізор. Ён убачыў звычайныя недахопы падатковай работы і таму прапануе рэвізору акт перарабіць у бок зьмякчэньня вываду, а Гомельскаму акрфа патаварыску рэкамэндаваць пераабкласьці некаторых больш моцных гандляроў у бок павялічэньня ім падатку. У выніку зьявіліся два акты рэвізіі Гомельскага акрфа і наступная фармулёўка першага акту, якая, пералічваючы недахопы ў рабоце, зазначала: «акрфінаддзелам зроблена вельмі мала. Ня былі выкарыстаны ўсе шляхі і савецкія, і партыйныя для таго, каб завастрыць увагу на гэтых пытаньнях усіх арганізацый» прыняла, мабыць па віне машыністак (?!) наступную форму: «акрфінаддзелам зроблена вельмі многа. Былі выкарыстаны ўсе шляхі і савецкія і партыйныя дзеля таго, каб завастрыць увагу на гэтых пытаньнях усіх арганізацый».

Такім чынам, падатковае кіраўніцтва НКФ замест таго, каб са ўсёй цяжкасьцю ўдарыць па носьбітах права-апартуністычнага ўхілу на практыцы ў Гомельскім акрфа, гэты факт замазала і дало ім магчымасьць працягваць сваю палітыку ў адносінах да прыватніка і ў далейшы час, дало магчымасьць Гомельскаму акрфа і ў далейшым недаабкладаць буйных гандляроў. Падатковае кіраўніцтва ім, як кажуць, паківала пальцам з прыказкай: «не балуйся хлопцы», а то другі раз можа выйсьці няпрыемнасьць. Для каго няпрыемнасьць, падатковае кіраўніцтва не сказала. І таму мы думаем, што ва ўсякім-жа выпадку не для тых гандляроў-гуртавікоў і поўгуртавікоў з г. Гомелю, **якія і ў гэтым годзе недаабкладзены таксама, як і ў мінулым.**

Калі да гэтага дадаць яшчэ справу Менскага акрфа работа якога ўжо добра ўсім вядома, дык стане зусім зразумелым, што кіраваньне з боку падатковага кіраўніцтва падатковай работай было і застаецца на сёнешні дзень **недастатковым.** Падатковае кіраўніцтва НКФіну да гэтага часу трымаецца цьвёрдае традыцыйнае прыказкі «сьмецьця з хаты ня вынось» і як мы бачым ня выносіць.

Інакш зусім нельга было-б растлумачыць таго факту, што ў Менскім акрфа, пад носам падатковага кіраўніцтва, пры наяўнасьці **не аднае, а некалькіх у апошні час рэвізій** падатковае работы з боку НКФіну, расквітнеў махровы букет «астраханшчыны», блізарукія рэвізоры з падатковага кіраўніцтва, якога і не заўважылі. Чаму гэта так, а ня інакш? Нам здаецца, пытаньне вусім яскравае і дадатковых тлумачэньняў не патрабуе.

Рэвізоры трымаліся прынцыпу свайго начальніка—замазваць, ну і, зразумела, замазалі-б, але тое, што замазвала падатковае кіраўніцтва, знайшоў хтось іншы. І зрабіў вельмі вялікую няпрыемнасьць падатковаму кіраўніцтву НКФ.

У пытаньні ападаткаваньня папоў з боку падатковага кіраўніцтва НКФ таксама мела месца «выпраўленьне» клясавай лініі. Папы недаабкладаліся на працяту доўгага часу падаткам ня толькі на Менскай, але і па іншых акругах і гэта добра было вядома падатковаму кіраўніцтву. Між тым, ня гледзячы на гэта, падатковае кіраўніцтва дае распараджэньне ўсім акрфа распаўсюдзіць ільготы па мясцовых падатках на папоў і будынкі рэлігійнага культу ў сельскіх мясцовасьцях. І колькі з-за гэтых ільгот прышлося паваяваць Полацкаму акрыканкому, каб скасаваць нявытрыманае з клясавага пункту погляду распараджэньне падатковага кіраўніцтва НКФіну.

І толькі ўмяшаньне ў гэтую справу СНК БССР дало магчымасьць атрымаць перамогу Полацкаму акрфа, а не падатковаму кіраўніцтву НКФ. А былі-б у Полацкім АВК такія людзі, як і ў падатковым кіраўніцтве, у якіх-бы быў настрой таксама замазваць, дык папы і зараз карысталіся-б ільготамі па мясцовых падатках і ўзносілі-б хвалу «ўсявышняму» за шмат гадоваё жыцьцё правых практыкаў з НКФіну БССР.

***

Зараз надыходзіць тэрмін чысткі ячэйкі НКФіну, а таксама чысткі паркамфінаўскага цэнтральнага апарату. Прыведзеныя вышэй факты яскрава кажуць за тое, што як у ячэйцы НКФіну, гэтак і наогул у яго апараце ёсьць асобы, якія сьвядома ці несьвядома льлюць ваду на млын нашых клясавых ворагаў, якія патураюць нашым клясавым ворагам, якія баяцца са ўсёй рашучасьцю і цьвёрдасьцю праводзіць правільную клясавую лінію.

Неабходна шляхам шырокай самакрытыкі ўскрыць усе балючыя моманты падатковай работы НКФ і тых асоб, якія праводзяць гэтыя недахопы на практыцы. Неабходна таксама праверыць, як рэагавала на гэтыя недахопы ў рабоце апарату ячэйка ў цэлым і паасобныя яе члены.

РУДНІЦКІ

Сацыялістычнае спаборніцтва

Энтузіязм—у арганізаванае рэчышча

(Абутковая фабрыка ВСНГ, Менск)

Рабочыя абутковай фабрыкі захоплены спаборніцтвам. Сярод абутнікаў ёсьць шмат энтузіястых, якія гатовы нават на матэрыяльныя ахвяры, абы толькі дабіцца мэты — зьніжэньня сабекошту і павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Характэрным для гэтага баявога настрою могуць служыць наступныя факты. Фабрыка ў апошні час пашыраецца, у яе ўліваецца вялікі працалектыў абутнікаў — у некалькі соцень чалавек. У сувязі з гэтым у рабоце фабрыкі назіраецца рад перабояў, здараюцца і прастоі. І вось некаторыя рабочыя адмаўляюцца ад запісу прастояў, якія павінны ім быць аплачаны, як прастоі па віне адміністрацыі. Некаторыя групы рабочых проста **ўтойваюць прастоі.** Гэта гаворыць аб імкненьні перадавых рабочых дабіцца эканоміі ў вытворчасьці, хоць-бы за кошт уласнае кішэні.

Зразумела, ніхто ня можа ўхваліць такіх адносін рабочых да прастояў, хоць гэтыя адносіны і сьведчаць аб гатоўнасьці рабочых ісьці на любыя ахвяры ў інтарэсах вытворчасьці. Па маёй думцы, трэба не хаваць прастояў, а наадварот, выяўляць іх, выкрываць прычыны прастояў і моцна біць на вінаватых у іх. А мы ведаем, што часта прастоі здараюцца ад таго, што адміністрацыя і майстры ня ўмеюць сваячасова распарадзіцца. **Здаровая самакрытыка рабочых дапаможа ліквідаваць прастоі і выратуе рабочых і прадпрыемства ад непатрэбных ахвяр.**

Таксама шчыра ўзяліся абутнікі за праверку сацспаборніцтва. Яшчэ задоўга да прыезду брыгады ВсеЦСПС на чале з тав. Бабушкіным на абутковай фабрыцы былі створаны тры праверачныя брыгады па 10 чалавек кожная. Але, ня сустрэўшы падтрыманьня вытворчай і культурнай камісіі, не атрымліваючы належных дырэктыў ад цэнтральнага праўленьня саюзу гарбароў, праверачныя брыгады паставілі сабе задачу вузка вытворчага характару, г. зн. вывяўць вынікі сац. спаборніцтва па вытворчых паказаньнях. Але праверачныя брыгады не паставілі сабе мэты ўцягнуць як мага больш рабочых у праверку сац. дагавароў, захапіць увесь калектыў ідэяй сац. спаборніцтва. Памылка была напраўлена з прыездам тав. Бабушкінай. На двух сходах праверачных брыгад і актыву былі прапрацаваны інструкцыя ВсеЦСПС і праграма праверкі сац. спаборніцтва, распрацаваная АТЭ ВсеЦСПС (зьмешчана ў «Труде», № 220).

Гэтыя два сходы ўнесьлі шмат ясناсьці і ёсьць усе падставы думаць, што праверка сац. спаборніцтва на фабрыцы абутку пойдзе па правільным шляху.

ВЫПАДКОВЫ

АБ НАШАЙ „АУТАНОМНАЙ РЭСПУБЛІЦЫ“

(Завод «Дрэваапрацоўшчык», Менск)

Праверачныя брыгады на нашым заводзе зьбіраюцца прыступіць да праверкі выкананьня сацдагавору. Зразумела, у нас ёсьць і станоўчыя і адмоўныя моманты. Напрыклад, па лесапільнай вытворчасьці мы перавысілі праграму вытворчасьці, па мэблевай — ня выканалі праграмы, затое моцна палепшылі якасьць прадукцыі.

Добрую традыцыю ўстанавілі майстры. Яны выклікаюць адміністрацыю — у асобе дырэктара — на сваячасовае забесьпячэньне матар'ялямі, сырцом і г. д.

Але і адмоўных момантаў — хоць адбаўлай.

Улетку ў нас стварылася ўдарная брыгада, назвала сябе «паказальнай». І... паказала ўсім, як ня трэба працаваць ударнай брыгадзе. Карацей кажучы, брыгада хутка распалася і ніхто ня прышоў ёй на зьмену.

Поэна ў нас пачалося сацспаборніцтва. Агульназаводзкі дагавор на спаборніцтва быў у нас заключан толькі 25-га жніўня. А будаўнічая гарачка ў нас скончылася яшчэ ўвесну — новы мэблевы завод быў пушчан у нас у сакавіку г. г.

Але самая галоўная хіба тая, што наш завод прадстаўляе сабою нібы «аўтаномную рэспубліку». Да гэтага часу завод «Дрэваапрацоўшчык» ня ўступіў у спаборніцтва з іншым заводам. Іншыя заводы выклікаюць на спаборніцтва па некалькі заводаў, а наш і аднаго ня выклікаў. Тлумачыцца гэта тым, што нашы кіраўнікі ня хочуць спаборнічаць з абыякім заводам, ім падавай завод, які ў дакладнасьці быў-бы падобны на завод «Дрэваапрацоўшчык»—і па асабліваściях вытворчасьці, і па маштабе работы і г. д. Зразумела, дакладна такі-ж завод знайсьці цяжка. Ну, значыць, можна і пачакаць. Можа праз некалькі год і пабудуюць дзе-небудзь спэцыяльна такі завод, як «Дрэваапрацоўшчык», каб было яму з кім уступіць у спаборніцтва.

А пакуль што зьяўляемся «аўтаномнай рэспублікай» і нікога ведаць ня хочам.

Праверачныя брыгады павінны вывяўць ўсе тормазы спаборніцтва і выставіць іх на абгаварэньне рабочай масы.

СТОЛЯР.

СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ПРАВЕРАЧНУЮ БРЫГАДУ

(Добруская фабрыка „Гэрой Працы“)

Праверачныя брыгады на фабрыцы «Гэрой Працы» створаны яшчэ 21-22 верасьня. Усяго сабралася чалавек 50, якія пажадалі прыняць удзел у праверцы дагавароў.

Праз чатыры дні быў ужо выпрацаваны плян дзеяньня, яшчэ праз дзень пачаліся інструктарскія нарады праверачных брыгад, на гэтых нарадах брыгады падзяліліся на групы для прапрацоўкі паасобных пытаньняў спаборніцтва і выбралі старшых брыгадзіраў, а яшчэ праз дзень брыгады прыступілі да праверкі дагавароў.

Такая хуткасьць падрыхтоўкі тлумачыцца тым, што **самі брыгады ўступілі ў спаборніцтва на хутчэйшае сканчэньне праверкі** (усяго брыгад створана 4).

Спаборніцтва—ня пусты гук. Праверачная брыгада па камэрным цэху 2-га кастрычніка працавала да 12 гадзін ночы, падсумавала сабраны матар'ял. Думаці выйсьці пераможцамі са спаборніцтва, аднак, пры падагуленьні вынікаў аказалася, што брыгада не ахапіла ўсіх пытаньняў спаборніцтва. Напрыклад, не закранута было пытаньне аб эканоміі, атрыманай ад прапаноў рабочых, ня ўлічана выпрацоўка на аднаго чалавека і г. д. Прыцягнута таварачэй 1-га кастрычніка на фабрыцы адбыўся вытворчы вечар моладзі па пытаньні аб праверцы і мэце спаборніцтва. На вечары прысутнічалі ўдарныя брыгады і многія ўдзельнікі сац. спаборніцтва.

У той-жа дзень адбылося пасяджэньне Бюро ІТС, якое парашыла прымацаваць па 2-3 інжынэрна-тэхнічных працаўнікі да кожнай праверачнай брыгады для аказаньня дапамогі ў справе выяўленьня тэхнічных паказальнікаў.

Падвялі рабкоры. 29-га верасьня павінна была адбыцца інструктарская нарада рабкораў. Нарада не адбылася, бо большасьць рабкораў не зьявілася.

З папярэдніх даных праверкі сац. дагавароў ужо відны асноўныя недахопы спаборніцтва.

Ні фабком, ні цэхавыя прафбюро, ні адміністрацыя за ўвесь пэрыяд спаборніцтва не інфармавалі рабочых аб ступені выкананьня пунктаў сац. дагавору. Удзельнікі спаборніцтва па агульна-фабрычным дагаворы ня ведалі, як дагавор выконваецца. Гэта прывяло да некаторага зьніжэньня тэмпу спаборніцтва.

Невыстарчальна праведзена і растлумачальная работа. На фабрыцы ёсьць падвы групы рабочых, якія яшчэ не

Пры паскораных тэмпах зрабіць упорна якасьць

Увесь заводзкі калектыў у цэлым і кожны дырэктар, інжынэр і рабочы ў паасобку павінны несьці адказнасьць за якасьць прадукцыі

ТРЭБА ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ

Паскараючы тэмпы вытворчасьці і тым павялічваючы разьмер прамысловае прадукцыі, дабіваючыся зьніжэньня сабекошту, мы ў той-жа час часта выпускаем з-пад увагі ўсю важнасьць вырабу добраякаснае прадукцыі. Між тым, мы ні ў якім выпадку ня можам дапусьціць, каб нашы фабрыкі і заводы выпускалі нядобраякасную прадукцыю другога і трэцяга гатунку. Наша сацыялістычная прамысловасьць павінна нам даваць ня толькі многа прадукцыі, ня толькі танныя, але і тавары добрай якасьці. Бо толькі тады, калі ў нас будуць высокаякасныя прамысловыя тавары, мы здолеем вытрымліваць канкурэнцыю на замежных рынках. Бо рабочы ў горадзе і селянін у вёсцы часта на якасьці прамысловых вырабаў судзіць аб савецкай уладзе, бо шматлікія рабочыя дэлегацыі, што прыяжджаюць да нас з-за межаў, уважліва прыглядаюцца да таго, што і як вырабляе гаспадар краіны—рабочая клясса.

І таму пытаньні якасьці прадукцыі павінны быць пастаўлены ў рад пытаньняў першачарговае важнасьці, каб дабіцца рашучага пералому ў гэтай галіне.

АСНОЎНЫЯ ХІБЫ ПРАМЫСЛОВАЕ ПРАДУКЦЫІ

Саюзная прамысловасьць, экспартуючыя арганізацыі, каапэрацыя і самі спажыўцы наракаюць на слабую якасьць прадукцыі, якую выпускае беларуская прамысловасьць. Гэтыя скаргі ў асноўным (паасобных групах тавараў) зводзяцца да наступнага.

Па **папяровай** прамысловасьці—няроўная абрэзка гільзавых бабін, плямістасьць і слабая трываласьць на разрывы, няроўнамерная шчыльнасьць шпалер пры наліччы плям і дрэннага абрэзу, дрэнная праклейка і сартаваньне паперы для пісаньня. За апошні час пагоршылася якасьць паперы «вержэ» на фабрыцы «Спартак». Амаль на ўсіх фабрыках Папертрэсту нездавальняючая ўпакоўка.

Асноўныя недахопы **шкляных вырабаў** заключаюцца ў наступным. Няроўнамерная таўшчыня ваконнага шкла пры вялікім выхадзе ніжэйшага гатунку. Ляпнавае шкло—няроўнамерная таўшчыня сьценак, няправільная абрэзка, нездавальняючая шліфоўка, бурбалкі ў шкле (асабліва гэта адносіцца да хуты «Кастрычнік»). Шклянкі гуты імя Домбаля не стандартнай формы, з многімі дэфектамі, як вышчарбленыя краі, бурбалкі на сьценках.

Па **Лесбеле** адзначаюцца наступныя дэфэкты: дрэнная сартаваньне і ўпакоўка (дахі), паніжэньне гатунку пілаванага матар'ялу ў выніку пагоні за колькасьцю распіловак.

З боку Цэнтраземскладу, Белсельсаюзу паступалі скаргі па адрасе **Белмэтапятрэсту** на якасьць сельска-гаспадарчых машын, на дэфэкты запасных частак, на дрэнную канструкцыю некаторых плугоў і якасьць ліцьця.

З ліку тых шматлікіх упіканьняў, якія ў свой час кідаліся **Швэйтрэсту**, мы можам адзначыць наступнае: няроўнамерная сьцілка вату ў зімовым таварах, нездаволенасьць спажыўцоў якасьцю і афарбоўкаю футраных тавараў, скаргі каапэрацыі на дрэнную ачыстку зімовай вопраткі ад ваты, выпускаемы асартымэнт гатовай вопраткі па сваіх разьмерах не адпавядае запатрабаваньням насельніцтва. Усё-ж трэба зазначыць, што за апошнае паўгодзьдзе колькасьць скаргаў на якасьць швэйных вырабаў моцна скарацілася і спыніліся выпадкі звароту тавараў.

Нараканьні на вырабы **Белскуртрэсту** зводзяцца да наступнага: выпушчаныя хром і апойкі маюць цэлы рад дэфэктаў, каляровы шаўрэт дрэнна фарбуецца, нездавальняючая апрацоўка абутку (Віцебск).

Якасьць прадукцыі беларускага **запалкавага** трэсту не заўсёды адпавядае стандарту, нядобрая аклейка скрыначак (са зморшчкамі), няпоўная пакладка скрынчак менш 55 штук).

Па **галянтарэйных вырабах**—нездавальняючая якасьць грабнёў у адносінах фасонаў, фарбы і шліфоўкі. Дрэнная апрацоўка скураных галянтарэйных вырабаў, нядобраякасныя замкі.

ДЗЕ ПРЫЧЫНЫ ПАГОРШАНЬНЯ ЯКАСЬЦІ

Асноўныя прычыны нядобраякасьнасьці прадукцыі, апрача слабое якасьці сырцу (хром, тэкстыльныя матар'ялы, сырэц для трыкатажных вырабаў), заключаюцца ў неналежным унутрызаводзкім кантролі, у слабым наглядзе за выкананьнем устаноўленых стандартаў, у слаба разгорнутай сетцы фабрычна-заводзкіх лябараторый.

Далей мы наглядаем няўважлівыя адносіны да сартаваньня і бракоўкі гатовых вырабаў, нэвыстарчальнае ўжываньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэньне якасьці прадукцыі, імкненьне прадпрыемстваў да атрыманьня колькаснага эфэкту за кошт пагоршаньня якасьці.

Трэба асабліва адзначыць слабы ўдзел рабочых мас (вытворчыя нарады і камісіі) у справе павышэньня якасьці прадукцыі і няпоўнае высьвятленьне гэтых пытаньняў у друку і насьценных газэтах. Таксама і сацыялістычнае спаборніцтва. Напрыклад, рабочыя цэху друкароў да гэтага часу ня лічаць патрэбным удзельнічаць у спаборніцтве, матывуючы тым, што яны і так добра працуюць.

Вытворчыя камісіі асобных цэхаў не аказаліся на вышыні. Па камэрным цэху, дзе працуе 360 чалавек, за пэрыад красавік-верасень праведзена ўсяго два пасяджэньні вытворчай камісіі і ніводнае вытворчае нарады.

Цэхбюро і вытворчыя камісіі не рабілі ўдарным брыгадам дапамогі ў іх рабоце. Выклікі асобных рабочых не афармляліся. Напрыклад, група рабочых, якія працуюць на машыне № 2, уступіла ў спаборніцтва, стварыўшы ўдарную брыгаду. На іх выклік адгукнуліся іншыя зьмены. Аднак, адсутнасьць дапамогі з боку цэхавых арганізацый сарвала спаборніцтва. Паступова аб ім забылі.

У спаборніцтве па фабрыцы «Гэрой Працы» ёсьць яшчэ рад недахопаў. Задача праверачных брыгад—вывяўць недахопы і зрабіць немагчымым далейшае іх паўтарэньне.

В. Д.

НЕКАТОРЫ ЗРУХ ЁСЬЦЬ, АЛЕ НЕ НАЛЕЖНЫ

Трэба ўсё-ж сказаць, што ў самы апошні час тут наглядаецца некаторы зрух, рад мерапрыемстваў прыняты, і па некаторых групах тавараў мы ўжо маем некаторыя паляпшэньні якасных паказальнікаў. Але ўсё гэта робіцца вельмі марудна і не сыстэматычна, няма сьвядомасьці поўнай адказнасьці (як з боку адміністрацыі, так і тэхнічнага пэрсаналу і калектыву рабочых) за якасьць выпусканае прадукцыі.

ШТО ЗАРАЗ ТРЭБА ЗРАБІЦЬ

Што зараз трэба зрабіць для паляпшэньня якасьці прамысловае прадукцыі?

Мы спынімся толькі на некаторых больш важных мерапрыемствах, якія падказваюцца жыцьцёвай практыкай.

Трэба ўзмацніць унутрызаводзкі кантроль у паасобных стадыях вытворчасьці—шляхам арганізацыі фабрычна-заводзкіх лябараторый і ўстаноўкі кантрольных прыбораў. Пры гэтым работа лябараторый павінна насіць ня толькі дасьледчы характар. Яна павінна цесна зьвязацца з усімі вытворчымі працэсамі.

У больш буйных каапэрацыйных цэнтрах трэба арганізаваць лябараторна-асартымэнтныя пункты для сыстэматычнага кантролю за асартымэнтам спажывецкіх тавараў. Вялікую карысьць можа таксама прынесьці абсталяваньне на ўсіх прадпрыемствах выставак узораў бракаваных тавараў з паказаньнем прычын браку і мер для іх зьнішчэньня. Наогул, было-б мэтазгодным арганізаваць у Менску гандлёвы музэй—гэта пытаньне трэба было-б узьняць і распрацаваць.

Пры распрацоўцы вытворчых праграм трэстамі і Белсампрамсаюзам трэба запрашаць прадстаўнікоў каапэрацыі для вучоту іх указаньняў і прыстасаваньня асартымэнту, разьмеру і фасону тавараў да патрабаваньняў спажывецкага рынку.

Крымінальны кодэкс трэба папоўніць пунктам аб крымінальнай адказнасьці за выпрацоўку і выпуск лёўна нядобраякаснай прадукцыі.

Нарэшце, і гэта самае галоўнае—трэба прыцягнуць пільную ўвагу рабочай грамадзкасьці да пытаньня якасьці прадукцыі—тут павінен шырока адгукнуцца наш друк і насьценгазэты. Трэба павялічыць вытворчую прапаганду на прадпрыемствах пры актыўным удзеле інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, пры абавязковых парадах кол пытаньняў канкрэтнага паляпшэньня якасьці асобных вырабаў.

Клясавы вораг у працалектыве „Утылізацыя“

[illegible] «Утылізацыя». У артыкуле «Як утылізуе «Утылізацыя» («Зьвязда», № 272 ад 27 лістапада 1928 г.) зьвярталася ўвага партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый на неабходнасьць зьмены кіраўніцтва працалектывам, узмацненьня культурна-масавай і палітычна-выхаваўчай работы сярод рабочых і работніц «Утылізацыі».

Наш артыкул выклікаў тады ўвагу і райкому КП(б)Б, і ЦП саюзу саўгандальслужачых і кіраўніцтва працалектывамі. Вылучаліся камісіі, прымаліся вывады, рэзалюцыі, праводзіліся сходы работніц і г. д.

МЕНСК

БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ"

Партыйцы наборнага цэху 1-й дзяржруднарні выклікаюць на спаборніцтва партыйцаў машыннага і пераплётнага цэхаў і падсобных майстэрань Белдзяржвыдавецтва.

Ячэйка КП(б)Б наборнага цэху 1-й дзяржруднарні (Менск) пастанавіла падпісацца ўсім членам і кандыдатам партыі на «Зьвязду» і павесьці растлумачальную работу аб значэньні «Зьвязды» —сярод беспартыйных рабочых.

Ячэйка наборнага цэху выклікае на спаборніцтва на лепшае распаўсюджаньне «Зьвязды» ячэйкі КП(б)Б машыннага і пераплётнага цэхаў друкарні і ячэйку падсобных майстэрань Белдзяржвыдавецтва.

Разгрузіць падатковы апарат ад непатрэбнае работы

Спыніць дармовае абслугоўваньне кулака ў фінансавых органах

Кулацкія скаргі і хадайніцтвы павінны аплачвацца гэрбавым зборам

Практыка паказала, што кулакі абкладзеныя сельгаспадаткам у індывідуальным парадку, дамагаюцца ўсякімі спосабамі зьняць ярлык «індывідуала».

Карыстаючыся законам аб сельскагаспадарчым падатку, кулакі падаюць бясплатна скаргі усюды, куды толькі ім уздумаецца. Выяўлены выпадкі, калі кулакі пад капірку адразу пісалі скаргі ў 7-8 экзэмплярах і потым рассылалі іх ва ўсе канцы СССР. Мала таго яны цэлай кампаніяй прыяжджалі ў ЦВК, НКФ і іншыя цэнтральныя ўстановы і тут-жа падавалі напісаныя імі заявы. Між тым, значная частка гэтых скаргаў шыта белымі ніткамі, зьяўляецца беспадстаўнай і, аразумела, не здавальняецца. Гэтыя скаргі толькі адпімаюць час у працаўнікоў установ і перашкаджаюць ім займацца патрэбнай справай.

Паглядзім у НКФ. Вы там заўсёды можаце спаткаць кулакоў, якія на некалькі гадзін гутараць з працаўнікамі, адрываючы іх ад работы. Такая-ж карціна ў РСІ, прыёмных ЦВК, у рэдакцыях газэт.

У адносінах падачы скаргаў кулакі карыстаюцца правамі беднякоў і сярадняцтва. Навошта такая пашана кулаку? Ад нэпмана ў горадзе за кожную заяву спаганяецца гэрбавы збор. Гэта прымушае яго больш сур'ёзна падыйсьці да справы, падумаць, ці ёсьць ў яго падстава для абскарджаньня, ці можна спадзявацца на здавальненьне скаргі, ці варта траціць 2 руб. на заяву. Гэта-ж прымушае нэпмана прытрымліваца устаноўленнага тэрміну падачы скаргі.

Кулак—вясковы капіталісты і нэпман —гарадзкі капіталісты, па сутнасьці аднаго поля ягадкі. Яны зьяўляюцца ворагамі сацыялістычнага будаўніцтва, яны адноўлкава супрацьўляюцца ўсякім мерапрыемствам савецкай улады.

За што-ж дарэмна абслугоўваць кулака?

Усіх пачаўшы гэты момант, Наркамфін растлумачыў усім фінансавым органам, што ўсе скаргі і хадайніцтвы па сельскагаспадарчым падатку, якія падаюцца кулакамі ў сельскія саветы і раённыя падатковыя камісіі, не аплачваюцца гэрбавым зборам. Скаргі і хадайніцтвы, якія падаюць кулакі ў акруговую падатковую камісію і Наркамфін, а таксама на ўсякія акруговыя і цэнтральныя ўстановы, павінны аплачвацца гэрбавым зборам у разьмеры 2 руб., пачынаючы з 1-га кастрычніка 1929 году. Усякія скаргі без аплаты гэрбавым зборам ня будуць разглядацца. Трэба думаць, што гэта мерапрыемства разгрузіць савецкі падатковы апарат ад непатрэбнай работы.

М. Т.

Мільёны рублёў на стыпэндыі студэнтаў

У новым навучальным годзе на выдачу стыпэндый студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, тэхнікумаў, вучням прафтэхшкол адпушчана па дзяржбюджэце 2.898.000 рублёў—на 55 проц. больш чым у мінулым годзе. З 17.765 [illegible] стыпэндыі атрымаюць 10.578.

[illegible]т забясьпечаньня стыпэндыямі [illegible] у вэтэнстытуце павялічыцца з [illegible] да 45, па пэдагагічным і с.-г. тэхнікумах з 49 проц. да 52 проц., па індустрыяльных тэхнікумах з 56 проц. да 65 проц. На хэмфаку БДУ 75 проц. студэнтаў атрымаюць стыпэндыі, з іх 35 стыпэндый па 35 руб. і 40 стыпэндый па 100 руб. Па фізкультурным тэхнікуме стыпэндыямі будуць забясьпечаны ўсе слухачы. Павялічаны таксама і разьмер стыпэндый.

Прышчэпаў выключаны з складу ЦП саюзу с.-г. рабочых

За праваапартуністычную дзейнасьць і сыстэматычнае скажэньне клясавай лініі ў кіраўніцтве і зямельнымі органамі, за ненаведваньне пленуму ЦП саюзу с.-г. рабочых бяз уважлівых прычын, прэзыдыум ЦП выключыў Прышчэпава з складу членаў ЦП. Пытаньне аб гэтым будзе пастаўлена яшчэ на чарговым пленуме ЦП.

Зварот тав. Галадзеда

Учора вярнуўся з Масквы старшыня СНК БССР т. Галадзед.—Тав. Галадзед прымаў удзел у пасяджэньнях Саюзнага СНК па пытаньнях аб кантрольных лічбах і бюджэце на 1929-30 год.

Пачалася праверка прафсаюзнага апарату

На прадпрыемствах Менску вылучаны рабочыя брыгады для праверкі апарату ЦСПСБ і ЦП прафсаюзаў. Пазаўчора адбыўся першы ход брыгад. Да праверкі рашана прыцягнуць лёгкую кавалерыю. Брыгады дэтальна вывучаць усю работу прафсаюзнага апарату.

25-га кастрычніка маркуецца пачаць праверку апарату ЦСПСБ. Праверка ўсяго апарату ЦП прафсаюзаў будзе окончана да 1-га лістапада.

Ушчыльніць установы

Вольныя памяшканьні — пад інтэрнаты

У Менску ёсьць рад устаноў, якія займаюць памяшканьні значна большыя, чым ім патрэбна. Каб аблягчыць жыльлёвы крызіс, гарсавет і камгас распрацавалі рад мер па ўшчыльненьні ўстаноў. Усекабанку прапануецца порайсьці ў памяшканьне камунальнага банку, Наркамаховы здароўя пераходзіць у памяшканьне Чырвонага Крыжу, Наркамасьветы будзе працаваць ў адным памяшканьні з Наркампрацы. У памяшканьнях, якія аслабяюцца пасьля ўшчыльненьня, будуць арганізаваны інтэрнаты для студэнцтва. Трэба адзначыць, што ўстановы супраціўляюцца ўшчыльненьню. Так, Усекабанк, які мае 25 супрацоўнікаў, займае памяшканьне на 60—80 служачых і ні ў якім разе не жадае пакінуць памяшканьне. Трэба прымусіць яго выканаць прапанову.

Сьледзтва па працоўных справах будзе вясьці пракуратура

Наркампрацы распрацаваў праект аб сьледзтве па працоўных справах органамі пракуратуры. Да гэтага часу сьледзтва вялося інспэктарамі працы, што вельмі заграмаджала работу.

Абсьледваньне аховы працы на прадпрыемствах

Наркампрацы пастанавіў правесьці на працягу кастрычніка-лістапада абсьледваньне 16 буйных прадпрыемстваў. Будуць абсьледваны наступныя прадпрыемствы: завод „Дрэваапрацоўшчык", „Бальшавік", „Энэргія" і „Камунар"—у Менску, фабрыка „Вэзуві", „Чырвоны Кастрычнік"--у Воршы, „Прафінтэрн"--у Віцебску і рад іншых прадпрыемстваў.

Абсьледваньне будзе праводзіцца спэцыяльнай камісіяй у складзе прадстаўнікоў Наркампрацы, адпаведных трэстаў, прафэсыянальных арганізацый і страхавых кас.

Каштоўная вынаходка

У бюро па садзейнічаньні рабочаму вынаходніцтву прадстаўлены цікавы праект новай дызэнфэкцыйнай камэры, складзены доктарам Марголіным і сьледарам Ліўшыцам. Камэра надзвычайна простай канструкцыі і падыходзіць для вясковых мясцовасьцяў. Паводле прыблізных падлікаў, камэра будзе каштаваць 250 рублёў замест 3.000 руб., што зараз каштуе новая дызэнфэкцыйная камэра.

13-га кастрычніка--урачысты пуск трамваю

Пробны пуск даў добрыя вынікі

8-га кастрычніка ноччу адбыўся пробны пуск аднаго трамвайнага вагону. Іспыты далі добрыя вынікі. Урачысты пуск трамваю назначаны на 13-га кастрычніка. Перад пускам адбудзецца ляпучы мітынг з удзелам усіх членаў гарсавету і прадстаўнікоў партыйных і прафэсіянальных арганізацый. У пачатку трамвай будзе хадзіць па лініі пасажырскі вакзал—Камароўка.

Перавод мэдычных устаноў на бесьперапынны тыдзень

З 15-га кастрычніка на бесьперапынны рабочы тыдзень пераходзяць наступныя мэдычныя ўстановы: Ляхаўская і Камароўская амбуляторыі, ясьлі № 4, 3-я кансультацыя, вэнэралёгічны і сухотны дыспансэр.

200 тысяч руб. на падрыхтоўку да ўсебеларускае с.-г. выстаўкі

Прэзыдыум ВСНГ пастанавіў адпусьціць на арганізацыйныя выдаткі па першай ўсебеларускай с.-г. і прамысловай выстаўцы 200 тысяч рублёў. Грошы пойдуць на закупку абсталяваньня, экспанатаў і г. д.

Брыгады для барацьбы з чаргамі

Праўленьнем МЦРК арганізавана 10 брыгад, якія будуць кантраляваць правядзеньне мерапрыемстваў па палепшаньні абслугоўваньня спажыўца.

Брыгады павінны выявіць прычыны стварэньня чаргі ў некаторых магазынах, улічыць магчымасьць рацыяналізацыі работы крам і г. д.

Брыгадамі будуць ахоплены ўсе крамы ЦРК.

Электрычная расьпілоўка лесу

Леобел выпісаў з-заграніцы 15 пілаў мэханізацыі расьпілоўкі лесу. Такая расьпілоўка ўводзіцца ў Беларусі ўпершыню. У Менску арганізуюцца курсы для падрыхтоўкі кваліфікаваных работнікаў па мэханізаваній расьпілоўцы лесаматар'ялаў.

Курсы для беспрацоўных жанчын

Менская біржа працы накіравала 500 жанчын на курсы швэйнікаў у Менску, Гомелю і Віцебску.

Курсанткам будзе выдавацца стыпэндыя і прадстаўлены інтэрнат.

Курсы па падрыхтоўцы кніжных агентаў

Пры аддзяленьні выдавецтва РСФСР адкрываюцца паўтарамесячныя курсы па падрыхтоўцы агентаў па распаўсюджаньні кніг.

На курсы прымаюцца беспрацоўныя, зарэгістраваныя на біржы працы. Прыём заяў на курсы да 8|X 1929 г.

ПАД ДУДКУ ЧУЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ

У свой час «Зьвязда» пісала аб тым, што камісія Менскага аддзяленьня Белсампрамсаюзу выключыла за «дэзарганізацыйную работу» ў арцелі «Пуглбленск» т. *Лавіта*, які выкрыў непарадкі ў арцелі, які значна дапамог ачысьціць арцель ад былых валютчыкаў і кантрабандыстых.

«Зьвязда» пісала аб тым, што камісія сваёй пастановай патурае чужым элемэнтам, якія імкнуцца пазбавіцца ад «выкрывацеля» і прапанавала прыняць Лавіта на работу. Цэнтральная камісія адмяніла пастанову Менскай камісіі і пастанавіла пакінуць Лавіта на рабоце ў сыстэме саматужнае каапэрацыі, прызнала, што зварот яго ў арцель «Пуглблеск» немагчымы і накіравала яго ў арцель «Жамчужына».

Пастанова была вынесена 5 тыдняў назад. За гэты час Лавіт атрымаў ад Менскага аддзяленьня БКС 5-6 паперак з прапановамі прыняць Лавіта на работу. Але «Жамчужына» лічыцца з гэтымі паперамі, як з леташнім сьнегам. Яна—«сувэрэнная дзяржава», якая, намінальна ўваходзячы ў сыстэму каапэрацыі, не падпарадкуецца ёй, адмаўляецца выканаць прапановы вышэйшай каапэрацыйнай арганізацыі.

Старшыня арцелі—камуністы Любошыц знаходзіць тысячу прычын і агаворак, каб ня выканаць пастанову.

— У нас няма новых мясц, пачакайце чысткі. Лавіт дачакаўся чысткі, зьнята 4 чалавекі. Варштаты аслабаніліся. Новая прычына—не хапае сыравіны, не патрэбны новыя людзі. Менскае аддзяленьне катэгарычна настайвае на сваім. Аказваецца, «арганізуецца новы цэх, трэба пачакаць... «Любошыц лезе з шкуры, каб збавіцца ад Лавіта. Дзе тут сабака зарыта?

Справа ў тым, што члены арцелі—на 75 проц.—былыя гандляры—ні ў якім разе не жадаюць мець ў сябе «рабкора» —выкрывацеля», які піша ў газэту, і Любошыц патурае ім, ён ня хоча сварыцца з чужым элемэнтам.

Для характарыстыкі Любошыца досыць падаць яго цікавую заяву Лавіту: «у нас устаноўлены ўклад у 500 руб. і 200 руб. паю».

Вось вам выкананьне дырэктывы аб ўцягненьні беднаты ў сыстэму саматужнае каапэрацыі

Палітыка Любошыца—гэта адрыжка часоў Мар'ясіна і Зельдовіча і ад гэтае адрыжкі трэба пазбавіцца, як мага, хутчэй.

САМАТУЖНІК.

Шкодніцтва былога дваранына Матусэвіча

Каўбаса з конскімі адкідамі

Матусэвіч Алесь—былы дваранін. Ён з 1910 году уладаў у мястэчку Асіпавічах буйнай каўбаснай майстэрняй і меў каўбасную краму. У майстэрні Матусэвіча працавала да 10 рабочых.

Арганізаваная ў мястэчку Асіпавічах каўбасная каапэрацыйная арцель «Прыклад» зусім падарвала прыватны каўбасны гандаль. Матусэвіч прымушаны быў здаць арцелі ў арэнду сваю майстэрню з усім абсталяваньнем. Матусэвіч стаў заклятым ворагам арцелі.

Асабліва Матусэвіч абураны быў супроць арцелі пасьля таго, калі адтуль быў выключаны яго сын Уладзімер, як пазбаўлены права голасу і замешаны ў шкодніцтве. Ня быў прыняты ў члены арцелі і другі яго сын Пётра.

Матусэвіч пачаў шукаць выгаднага моманту, каб адпомсьціць арцелі.

У верасьні месяцы гэтага году арцель «Прыклад» атрымала вялікі заказ на выраб каўбас для чэшскай Чырвонай арміі, якія павінны былі прыняць удзел у манэўрах.

Даведаўшыся аб гэтым, Матусэвіч парашыў, што падыйшоў самы зручны момант для помсты арцелі. 6-га верасьня прыпільнаваўшы, калі рабочыя арцелі пашлі на абед, Матусэвіч праз вакно пралез у майстэрню і прымяшаў у прыгатаваны для каўбасы фарш конскі кал. Гэтым Матусэвіч думаў падарваць давер'е да каапэрацыі, пашкодзіць яе рабоце і выклікаць абурэньне сярод чырвонаармейцаў.

Але намер шкодніка ня ўдаўся. Дзякуючы ў зажліваści ці рабочых, шкодніцтва было выкрыта і Матусэвіч сеў на лаўку падсудных.

21-га верасьня надзвычайная сэсія вярхоўнага суду разглядала гэтую справу у м. Асіпавічах.

Матусэвіч прызнаны вінаватым па 69 артыкуле КК і прыгавораны да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй на 3 гады з канфіскацыяй яго каўбаснай майстэрні.

ПАД СУД ЗА АГІТАЦЫЮ СУПРОЦЬ ОРГАНАЎ УЛАДЫ

У свой час была паслана на расьсьледваньне заметка пад загалоўкам «Антырэлігійная справа знаходзіцца пад сьледзтвам», дзе пісалася аб папоўскай агітацыі ў Тураўскім раёне, Мазырскай крузі. Справа разгледжана Мазырскім акруговым судом, які пастанавіў за нацкоўваньне жанчын супроць мясцовых органаў улады прытаварыць да пазбаўленьня волі на 6 месяцаў Царыка Сямёна, Вецік Марыну, Землянікі Агапу, Балбуцкага Яна, Чорную Хвядору, Сулім Аўдоцьцю і Калантай Яўхімію, Шкурка Настасью — на 4 месяцы прымусовых работ, Чорнага Яна — на 8 месяцаў пазбаўленьня волі за антысавецкую агітацыю, скліканьне нелегальных сходаў; Адамовіча Яна, Лавіцкага Юльяна — да пазбаўленьня волі на 1 год са строгай ізаляцыяй і з высяленьнем з БССР на 5 год.

Хроніка Мопр'у

Пры Менакругкому Мопр'у створаны 4 сэкцыі: па рабоце на вёсцы, па шефстве над палітзьняволенымі, вайсковая і грашовая, а таксама створана інструктарская група. Да працы ў сэкцыях прыцягнуты ўсе члены і кандыдаты акругкому.

З 15-га лістапада прэзыдыум АК пастанавіў распачаць кампанію зімовай дапамогі палітзьняволеным. АК прапануе шырока скарыстаць гэту кампанію для папулярызацыі задач Мопр'у, асабліва сярод сялян і працу па шэфстве над палітзьняволенымі. **Па кампаніі зімовай дапамогі маркуецца сабраць па Менскай акрузе 15 тысяч рублёў.**

Акругком Мопр'у выпісаў 500 агітацыйна - прапагандысцкіх бібліятэчак для ўсіх ячэек Менскай акругі. Гэтыя бібліятэчкі дадуць магчымасьць арганізаваць па райкомах і ячэйках курсы, гурткі рэвалюцыйнага руху, лекцыі, гутаркі і даклады.

Для зацьвярджэньня дагавору па спаборніцтве з Гомельскім акругкомам Мопр'у на пленуме, які адбудзецца 12 кастрычніка, выяжджае дэлегацыя ад Менску ў складзе т. т. **Цудзіна і Салаўёва.**

НАВУКА І ТЭХНІКА

ЦЭПЭЛІН І ЯГО ПАЛЁТ ВАКОЛ СЬВЕТУ

У выніку палёту цэпэліну вакол сьвету, устаноўлена некалькі рэкордаў. Вакол сьвету з Нью-Ёрку і назад у Нью-Ёрк дырыжабль праляцеў у 21 дзень—на два дні хутчэй за амэрыканскіх журналістых, якія летась зрабілі падарожжа вакол сьвету на самалёце і параходзе. Калі лічыць пачатковым і канцовым пунктам дырыжаблю Фрыдрыхсгафэн, дык рэкорд яго павышаецца на цэлыя суткі. Калі-ж вылічыць час, затрачаны на стаянкі, дык палёт вакол зямное кулі ён зрабіў за 13 лётных сутак з сярэдняй хуткасьцю 107 клм.

Цяпер дырыжабль падлягае дакладнаму агляду, бо практыка такіх доўгіх пералётаў, як сёлетні, будзе ўлічана пры пабудове другога дырыжаблю, які павінен быць скончаны на будучае лета. Новы дырыжабль будзе мець большую хуткасьць і больш камфартабэльным для пасажыраў.

Пасьля капітальнага агляду, «Граф Цэпэлін» зробіць некалькі дробных пералётаў па Эўропе. Праграма далейшых вялікіх пералётаў будзе выпрацавана пасьля звароту Эканэра з Амэрыкі.

УСХОД СОНЦА НА МЕСЯЦЫ

При дапамозе 23-цалёвага тэлескопу ў абсэрваторыі Прынстонскага унівэрсытэту (ПАЗШ) удалося сфатаграфаваць ляндшафт на месяцы ў часе ўсходу сонца — на гэтым мёртвым спадарожніку зямлі. Сфатаграфаваны ляндшафт уяўляе сабою плошчу ў 330 на 200 міль з так званымі пікамі Капэрніка, якія нагадваюць сабою групу кратэраў, якіх на месяцы налічваецца 200.000. Здымак рабілі ў сто разоў марудней, як звычайны здымак на зямлі, бо на месяцы прамень узыходзячага сонца перасоўваецца на паверхні з хуткасьцю 9, а не 100 міль у гадзіну, як на зямлі. Зьява, што адбылася на месяцы на працягу трох гадзін, у кіно паказваецца за дзьве хвіліны. Фільма ўдалася дасканала, і месячны ляндшафт на экране здаецца на адлегласьці ўсяго 1.000 міль ад глядача. У сапраўднасьці-ж адлегласьць паміж месяцам і зямлёю — 240.000 міль.

На месяцы няма атмасфэры, дзякуючы чаму там ня бывае змроку і досьвітак, а цемра ночы непасрэдна зьмяняецца сьвятлом дня, спаўзаючы з месячнае кулі як цепь.

ДЫРЫЖОРСТВА ПА РАДЫЁ

Практыка дырыжорства па радыё была праведзена гэтымі днямі ў Цурыху, адкуль дырыжэр Фішар кіраваў аркестрам у Лёндане, Парыжы, Бэрліне, Мілане, Вене, Цурыху. Удзельнікі аркестру знаходзіліся дома з навушнікамі і слухалі партытуру, якую Фішар граў па прыгушаным раялі. Перад аркестрантамі стаялі мікрафоны, якія перадавалі іх ігру ў Цурых, дзе паасобныя члены партыі «зьбіраліся» і ўжо як канцэрт, трансьлявалі для розных перадатачных станцый. З тэхнічнага боку практыка ўдалася, але з акустычнага і мастацкага боку канцэрт мае недахопы, бо мэлёдыі паасобных інструмантаў зьліваліся.

ДАЛЁКАБАЧНАСЬЦЬ БЭРЛІН — ЛЁНДАН

Першая практыка далёкабачнасьці з Бэрліну ў Лёндан і назад прайшла вельмі ўдала. Адзіны недахоп заключаецца ў тым, што малюнак на прыёмным экране «мільгаў», як гэта бывае з кінофільмамі. Гэта тлумачаць тым, што адпраўнік і прыёмнік ня былі добра ў унісон настроены, з прычыны перабойнае работы часовай бэрлінскай лябараторыі. Далёкабачнасьць праводзілася пры дапамозе прыбораў ангельца Брандэ, які працуе над імі больш трох год і дабіўся вельмі значных посьпехаў.

КІНО

„ГАНДЛЯРЫ СЛАВАЙ" (Кіно „Культура")

«На французска-нямецкім фронце бяз зьмен — гаворыць апошняе паведамленьне штабу.

На мове штабу гэта «бяз зьмен» азначае, што ідзе ўпартая бязрэзультатная барацьба за кожны кавалак зямлі. У перакладзе на мову вайны гэта значыць, што ні той, ні другі бок ня можа пахваліцца перамогай, што як і раней гінуць дзесяткі тысяч людзей, што не ўмаўкае жудасная сымфонія гармат і кулямётаў.

На фронце разгрываецца крывавая вакханалія вайны, а ў тылу ідзе шалёная спэкуляцыя на пастаўках для арміі.

Сям'я сумленнага буржуа-чыноўніка Баллэ атрымлівае паведамленьне, што іх сын сэржант Анры героем загінуў на фронце, што ён адзін ля кулямёту адбываў націск прускае гвардыі.

Але ня доўга гарае сям'я. Пасьляваенная Францыя, Францыя спэкулянтаў, банкіраў, заводчыкаў сьвяткуе перамогу над «бошам», яна задыхаецца ў чадзе шавіністычнага захапленьня, на трупах і крыві соцен тысяч людзей буржуазія будуе свой дабрабыт», сумленныя патрыёты гандлююць славай невядомых загінуўшых героеў. Робіць сабе кар'еру і бацька загінуўшага Анры: слава сына адкрывае перад ім дзьверы ў парлямант, праз труп сына ён пралазіць у міністры.

Стары Баллэ спэкулюе памяцьцю сына, ён выхваляе героя, яго патрыятычныя прамовы выклікаюць захапленьне разжырэўшых спэкулянтаў і какотак.

Раптам зварочваецца сэржант Анры, які 5 год прабыў у вар'яцкім доме пасьля кантузіі, атрыманай на фронце.

Зьяўленьне сына пагражае зруйнаваць ўсе пляны патрыётаў.

Жывы Баллэ, абураны парадкамі пасьляваеннай Францыі, — небясьпечны для буржуазіі. Яму прапануюць грошы за маўчаньне, але ён выкрывае махінацыі «гандляроў славай»; былы «кумір» буржуазіі становіцца яе ворагам і ўступае ў рады камуністычнае партыі.

Такі сюжэт фільму. Гэта цікавая тэма прапрацавана слаба. Тэхнічнае афармленьне далёка не на вышыні, здымкі нявыразныя. Карціна — другарадная прадукцыя Межрабпомфільму.

Б—ў.

Навіны Белдзяржкіно

Белдзяржкіно прыступіла да здымкаў карціны «Чорная кроў» з жыцьця рабочых нафтавай прамысловасьці Польшчы. Рэжысэр Тарыч выехаў для здымкаў у гор. Грозны, па пляне намечан выезд у Баку, Батум і Сэвастопаль.

***

Рэжысэр Корш закончыў здымкі карціны «Волат» у Банцараўшчыне і Прылуках. Зараз канчаюцца натуральныя здымкі ў м-ку Койданава.

***

У Ленінградзе здымаецца зараз карціна «Цётка Саша». Рэжысэр Хахлова. Карціна малюе рост сьвядомасьці вясковай жанчыны, пад уплывам арганізаванага калгасу.

***

Белдзяржкіно рыхтуецца да дня калектывізацыі. Выпушчана ў 8-мі экзэмплярах карціна «За калектывізацыю», якая на працягу кастрычніка будзе дэманстравацца ў вёсках.

Што зроблена па лістох рабселькораў

Выключаны з партыі Маліёнак Аршанскай акруговай кантрольнай камісіяй за растрату грамадзкіх грошай. Усе факты па заметцы пацьвердзіліся.

Чавускім РВК абкладзены індывідуальным падаткам загадчык Чавускай яўрэйскай школы **Слуцкер**, які мае кулацкую гаспадарку і ўтойваў ад падатку 6 гэктараў зямлі і 1 карову

Усім райінспэктарам нарасьветы Полацкае акругі загадана акрінспэктарыятам аб падпісцы на новы год для ўсіх культасьветных устаноў раёнаў на газэту «Зьвязда».

Накладзена адміністрацыйнае спагнаньне загадчыкам Менскай пашто ва-тэлеграфнай канторы на некаторых працаўнікоў Менскага тэлеграфу за дрэнныя адносіны да работы па заметцы «нядбайства на Менскім тэлеграфе».

Выселены з кватэр саўгасу «Молат» (Пухавіцкі раён) былыя рабочыя, якія звольнены за пакражу і п'янства, і ў гэтыя кватэры будуць заселены рабочыя, якія жывуць у халодных буды ках саўгасу.

Пабудова 8 „дамоў батрака"

Клюб на Мар'інскім балоце

У 1929-30 годзе па Беларусі намечана пабудова 8-мі «дамоў батрака». Вызначаны пункты пабудовы ў Койданаўскім раёне, Менскай акрузі, у Рэчыцкім раёнах, Гомельскай акрузі і г. д. Пры гэтых дамох будуць адкрыты інтэрнаты, стацыянарныя бібліятэкі і кіно. Кожны дом разьлічаны на абслугоўваньне 300 чалавек.

Адначасова прэзыдыум ЦП саюзу сельгаслесарабочых высунуў пытаньне аб пабудове ў саўгасе імя 10-ці годзьдзя БССР на Мар'інскім балоце клюбу на 600 чалавек. Будаўніцтва «дамоў батрака» і клюбу будзе каштаваць каля 500.000 руб.

— РЭСПУБ. БЮРО АРУ. У пятніцу, 11-га кастрычніка а 6 гадз. ўвечары у памяшканьні Аврза (пл. Волі № 4, д. Акрывыканному) адбудзецца сход ВЫТВОРЧА - ПРАМЫСЛОВАЙ СЭКЦЫІ АРУ, на якім будуць заслуханы даклады нам. гал. бухгалтара Леобелу т. Альпэровіча; 1) аб рацыяналізацыі вучоту дапаможных матар'ялаў (практыка Леобелу), 2) аб вучоце зарплаты пры калектыўнай зьдзельшчыне (практыка Леобелу) пасьля дакладу спрачкі. Запрашаюцца члены АРУ, а таксама рахункоўныя і статыстычныя супрацоўнікі прамысл.-вытворчых прадпрыемстваў. Яўка актыву абавязкова. Просьба не спазьніцца.

У чацьвер, 10 кастрычн. 1929 г. а 5 г. увеч. у памяшканьні прэзыдыуму БАН адбудзецца пасяджэньне камісіі на сацыялёгіі нац. пытаньня пры катэдры марксызму - ленінізму Бел. Акадэміі Навукі.

ПАРАДАК ДНЮ:

Даклад т. Шапавалава на тэму: «Праблема нацыі ў марксыцкай літаратуры».

Арганізацыйныя пытаньні.

Прысутнасьць членаў камісіі абавязкова.

Уваход вольны.

— Клюб навуковых працаўнікоў перайшоў на бесьперапынны тыдзень. Запіс у члены клюбу штодзенна. Перарэгістрацыя старых і запіс новых членаў у гурткі працягнут да 10 кастрычніка. 10 кастрычніка, а 9 г. увечары—агульны сход усіх запісаўшыхся ў гурткі. Пры клюбе — шір. Клюб адчынен з 6 г. увеч.

Студэнтка Камвузу Беларусі імя Леніна Гольдрэй Бэрта, якая працуе зараз у Сіроцінскім раёне, Віцебскай акругі, уносіць 5 руб. у ячэйку МОПР Камвузу на карысьць палітзьняволеных падшэфнай турмы і выклікае ўсіх студэнтаў Камвузу пасьледаваць яе прыкладу.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме камуністычнае асьветы (б. клюб Карла Маркса) будзе праведзена працаўнікамі Белкалгассаюзу кансультацыя аб калгасах для членаў шэфкатыву і рабочых брыгад.

Запрашаюцца і шэфпрацаўнікі Кастрычнікавага райкому.

— У пятніцу, 11-га кастрычніка г. г. роўна а 7-й гадз. ўвечары у залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца нарада загадчыкаў культ. аддзелаў ЦП саюзаў, загадчыкаў клюбаў і культ. камісій наступных 10-ці прадпрыемстваў:

«Бальшавік», швэйн. ф-ка «Акцябр», чыгуначныя майстэрні, заводы «Энэргія», «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», шкляны завод «Пралетары», фабрыка „Адраджэньне", 1-я друкарня, «Чырвоная Зара», хлебазавод.

Парадак дня:

1. Аб масавай каапэрацыйнай асьвеце

2. Аб арганізацыі нядзельных курсаў мэдыцынскіх ведаў.

— У чацьвер, 10-га кастрычніка, а 6-й гадз. увеч. адбудзецца у памяшканьні АК МОПР (Савецкая, 87) арганізацыйнае пасяджэньне інструктарскай сэкцыі. Выклікаюцца наступныя т. т.: Ліпманаў, Шкляр, Левітан (1-я Дзяржруднарні.), Нядзведзецкі, Шмэрлінг, Баранаў—эскадрон сувязі, Сташэўская—«Прагрэс», Норкінаў, ант № 12, Гурэвіч—т-ва п.-кат.

Яўка абавязкова.

— У чацьвер 10-Х, а 7-й гадз. увеч. у памяшканьні АК МОПР'у (Савецкая 87) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Мен. АК МОПР.

Парадак дня: 1) Плян работы Мен. АК МОПР і сэкцый.

2) аб сьвяткаваньні 12-ці годз. Кастрычн. Рэвалюцыі;

3) аб кампаніі зімовае дапамогі палітзьняволеным;

4) аб арганізацыі курсаў МОПР-актыву.

5) Бягучыя справы.

На пасяджэньне запрашаюцца члены Мен. АК МОПР'у якія знаходзяцца ў Менску, таксама гарадзкі актыў МОПР'у.

Просьба не спазьніцца.

Папраўка

У артыкуле А. К. «Праф. Крыльцоў зьняты з працы ў БДУ», апублікаваным у № 225, здарылася памылка.

Надрукавана: «камісія пастанавіла лічыць немагчымым і палітычна-шкодным даручэньне праф. Крыльцову выкладаньне буржуазнага права».

Трэба: «камісія пастанавіла лічыць немагчымым і палітычна-шкодным даручэньне праф. Крыльцову выкладаньня дзяржаўнага права».

У артыкуле «Рэвалюцыйная законнасьць — зброя клясавай барацьбы» («Зьвязда», № 228) замест слоў «перамагчы да канца працапартуністычныя спробы, паслабіць значэньне суду» і г. д. трэба чытаць «перамагчы да канца права-апартуністычныя спробы паслабіць значэньне суду» і г. д.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Сёньня, 10 кастрычніка, а 6-й гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб ступені выкананьня дагавораў па ахове працы.
(Даклад. т. т. ГОЛЬДЗІНБЕРГ і САКАЛІНСКІ).
Запрашаюцца прадстаўнікі: ВСНГВ, Інспэкцыі Працы, Акр. Выканкому і ўсіх трэстаў.

2. Аб рабочым забесьпячэньні.
(Даклад МЦРК і Акр. Гандлю).
Запрашаюцца прадстаўнік НК Гандлю і ФЗК заводаў: «Камунар», «Бальшавік», «Дрэваапрацоўшчык», Меншвэю і іншых прадпрыемстваў.

Усім ЦП саюзаў і фабзаўмясцкомам

У мэтах падрыхтоўкі кадраў сцэнарыстых з мясцовых сіл БЕЛДЗЯРЖКІНО пасылае 3 чал. у сцэнарную майстэрню пры кіно-фабрыцы БДК у Ленінградзе і 2 чал. на сцэнарныя курсы пры кіно-тэхнікуме ў Маскве.

Ня гледзячы на шырокае паведамленьне ў друку, усё-ж з ліку паданых заяў зусім мала заяў непасрэдна рабочых, што гаворыць аб слабой прапрацоўцы гэтага пытаньня на мясцох.

Белдзяржкіно яшчэ раз просіць паставіць гэтае пытаньне на абмеркаваньне на вашых прадпрыемствах з мэтай вярбоўкі на гэтыя курсы рабочай моладзі.

Пасланыя таварышы будуць забясьпечаны стыпэндыямі у разьмеры 75-100 руб.

Пры падборы кандыдатаў просім мець на ўвазе наступнае: пажаданы асобы з ліку маладых літаратараў, драматургаў, рабкораў і інш., якія цікавяцца спэцыяльна сцэнарнай справай. Важна таксама агульная культурная падрыхтоўка, разуменьне існуючай абстаноўкі ў галіне літаратуры, кіно, мастацтва, яснае разуменьне пытаньняў савецкай палітыкі ў гэтых галінах культурнага будаўніцтва.

Аб вылучаных вамі т. т. на гэтыя курсы просім паведаміць Белдзяржкіно не пазьней 15 кастрычніка г. г.

Белдзяржкіно.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР
Адчыненьне сэзону 1929-30 г.
СУБОТА, 12-га кастрычніка, спэктакль для рабочай моладзі. Білеты ў Доме Камсамолу. Пачатак а 9 гадз. увечары.
НЯДЗЕЛЯ, 13-га кастрычніка, спэктакль для каапэраваных арцеляй і саматужнікаў адзіночак. Білеты ў Менаддзе. Белсампрамсаюзу (Камуністычная, 6). Пачатак а 7 гадз. увечары
А. ВЗВЫЮРКЕ. БОТВІН

НАРАДА, ЯКАЯ СКЛІКАЛАСЯ МЕНАКРСТРАХКАСАЙ НА 10 КАСТРЫЧНІКА
АБ НОВЫМ ПАРАДКУ ВЫПЛАТЫ ДАПАМОГІ ПА ХВАРОБЕ САМЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ,
ПЕРАНОСІЦЦА на 12 кастрычніка а 6 гадзіне ўвеч. у памяшканьні Страхкасы.
Просьба да вылучаных прадпрыемствамі і ўстановамі для гэтай работы т. т. зьявіца без спазьненьня.
Менакрстрахкаса.

Паведамляецца, што ў нядзелю 13 кастрычніка а 11 гадзіне раніцы па Рабфаку (рог Унівэрсытэцкай і Чырвонаармейскай) у аўдыторыі № 21 склікаецца
СХОД УСІХ СТУДЭНТАЎ,
якія падалі заявы ў
РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ
РАДЫЁ-УНІВЭРСЫТЭТ

ШТО